НАТАЛЛЯ КАЧАНАВА ПРА РОЛЮ ЖАНЧЫН

МС



УЧАСТКОВЫ Ў СПАДНІЦЫ

МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 САКАВІКА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 45 (29159)

9-24 стар.
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

НАМАЛЯВАНА РАЗЦОМ

Унікальны майстар жыве ў Оршы — былы інжынер-канструктар завода «Чырвоны барацьбіт» Уладзімір ЛЕ́СНЕЎСКІ. Захапленнем пенсіянера стала разьба па дрэве.

— Узгадаў сваё дзяцінства, вясковы побыт і пачаў «ўваскрашаць» незабыўныя падзеі і малюнкі, — кажа майстар малой пластыкі. — Маляваць я не ўмею, таму маім аркушам стала дрэва.

Мне давялося сустрэць аршанскага маэстра на святкаванні «Масленіцы», паглядзець на калекцыю яго невялікіх скульптурак і ўпэўніцца, які ў яго незвычайны погляд і майстэрства валодання разцом. Нездарма імя Уладзіміра Леснеўскага папоўніла спіс самабытных рукадзелаў Саюза майстроў Беларусі. Нават драўляныя лыжкі, якія зробленыя для сапраўдных гаспадынь, і тыя нясуць адзнаку дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Анатоль КЛЯШЧУК,
фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Ужо шмат зроблена з моманту правядзення нарады ў кіраўніка дзяржавы па ўдасканаленні мер адміністрацыйнай адказнасці. Напрыклад, на некаторых дарогах павялічаны хуткасны рэжым, аптымізавана выкарыстанне сродкаў фота- і відэафіксацыі дарожных парушэнняў. Былі перагледжаны крытэрыі ацэнкі эфектыўнасці дзейнасці некаторых службовых асоб, якія вядуць адміністрацыйны працэс, вызначаны асноўныя паказчыкі выніковасці прымаемых мер па абароне жыцця і здароўя грамадзян, захаванні законнасці. Мы павінны разумець, што асноватворнымі арыенцірамі ў нашай рабоце па ўдасканаленні заканадаўчай практыкі павінны быць словы Прэзідэнта аб падрыхтоўцы цэласных і сістэмных дакументаў, якія ўлічваюць бягучы ўзровень развіцця краіны, перадавы замежны вопыт і айчынныя напрацоўкі».

КАРАТКА

- **Магілёўская «Стужка» выпускае за дзень да 15 тысяч чатырохслаёвых медыцынскіх масак.**
- На месцы былога ваеннага гарадка ў Гродне з'явіцца жылы раён на дзве тысячы кватэр.
- **Зямлю з месцаў баёў пада Ржэвам перадалі храму-помніку ў гонар Усіх Святых у Мінску.**
- Першы сабраны ў Вялікабрытаніі беларускі электробус будзе ездзіць па дарогах Нотынгема.
- **У гэтым годзе плануецца прадаць 370 аб'ектаў дзяржнерухомасці за адну базавую стаўку.**

ISSN 1990 - 763X

Цікавы вопыт

«ЗОРНАЕ» ЖЫЦЦЁ ДЗЯНІСА БУРКЕВІЧА,

або Як кінолаг з Маладзечна дрэсіруе чатырохногіх артыстаў

Ці кусаў вас калі-небудзь сабака? А вось Дзяніс Буркевіч з Маладзечна трапляў пад моцныя іклы чатырохногіх сяброў неаднойчы, прычым асэнсавана. Жонка пакеплівае з яго, маўляў, у мяне самы прыгожы муж ва ўсім свеце, бо шрамы ўпрыгожваюць мужчыну. Што паробіш, такая ў яго работа, якую ён выконвае сумленна. Дзяніс — кінолаг, дублёр, адзін з дрэсіроўшчыкаў у міліцэйскім серыяле «Мухтар. Новы след», што здымаўся ў Мінску. Абаяльная нямецкая аўчарка па мянушцы Мухтар нясе службу ў маскоўскай паліцыі. Дзякуючы свайму адметнаму нюху і кемлівасці «дэтэктыў» дапамагае героям серыяла знаходзіць доказы і лавіць зламыснікаў. Разам з ім яны раскрываюць нават самыя складаныя і безнадзейныя справы. У фільме шмат эпізодаў з пагонямі, бойкамі. Вядома, сабаку неабходна вымуштраваць на затрыманне зладзеяў. У ролі дублёра зламыснікаў і выступаў Дзяніс: нельга ж падстаўляць пад удар акцёраў.

Дзяніс БУРКЕВІЧ са сваёй першай аўчаркай Фіёнай.

СТАР. 4

Спажывец

БУДЗЕМ МЕЦЬ СВАІХ КРЭВЕТАК

Спецыялісты Мінсельгасхарча распрацавалі комплекс мер па развіцці рыбаводства

Як расказала намеснік начальніка аддзела галоўнага ўпраўлення інтэнсіфікацыі жывёлагадоўлі Мінсельгасхарча Вольга БАРЭЙША, у нашай краіне працягвае актыўна развівацца сажалкавае рыбаводства. Летась у сажалках нагадавалі больш за 14 тысяч тон рыбы. Больш за 618 тон з іх — каштоўныя віды. Да таго ж за год у Беларусі вылавілі 1106 тон азёрнай і рачной рыбы. Ці шмат гэта для краіны? Зусім не. Астатняе купляем.

Імпарт рыбы і прадуктаў з яе ў Беларусь за год склаў 168,7 тысячы тон. Акрамя таго, нашы спецыялісты выкарыстоўвалі квоты, выдзеленыя Расійскай Федэрацыяй у Баранцавым і Балтыйскім морах. За год, у прыватнасці, вылаўлена 3,6 тысячы тон траскі (97,4 працэнта ад квоты), 621 тона пікшы (92 працэнты ад квоты) у Баранцавым моры.

А зараз добрая навіна для гурманаў. Сёлета ўпершыню нашай краме далі квоту на вылаў 500 тон паўночнай крэветкі ў Баранцавым моры, у выключнай эканамічнай зоне Расіі. Няхай няшмат, але ўсё ж.

СТАР. 3

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Мы будзем прыхільныя інтэграцыйным працэсам, але пры гэтым мы будзем дакладна трымацца нашых інтарэсаў»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з Генеральным сакратаром Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Станіславам Засем

«Калі выпаў такі лёс сёлета для Беларусі — узначальваць усе інтэграцыйныя органы (Беларусь старшынствуе ў органах Еўразійскага эканамічнага саюза. — «Зв.»), мы будзем гэта рабіць годна... Мы будзем, як і раней, прыхільныя інтэграцыйным працэсам, у тым ліку і ў ваеннай сферы, але пры гэтым мы будзем дакладна трымацца нашых інтарэсаў. На гэту суперпрагматычную пазіцыю ты ведаеш, хто падштурхоўвае, — рэспублікі, якія знаходзяцца вакол гэтага «інтэгратара», — звярнуўся да генсека Прэзідэнт.

Фота БелТА.

Пакуль інтарэсы Беларусі цалкам супадаюць з інтарэсамі суседзяў, асабліва членаў Арганізацыі дагавора аб калектыўнай бяспецы, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Гэта пазіцыя сыходзіць з менталітэту беларускага народа.

Таксама кіраўнік краіны папрасіў генсека праінфармаваць аб прапановах Беларусі па партнёрстве і назіральніцтве ў АДКБ.

«Хацелася б, каб мы вырашылі гэтыя пытанні на чарговым саміце. І шэраг пытанняў, якія сёння стаяць перад кіраўнікамі дзяржаў АДКБ і патрабуюць рашэння», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Рашэнне адбылося, пагадненне ратыфікавана практычна ўсімі дзяржавамі АДКБ (Таджыкістан застаўся), увайшло ў сілу. І мы цяпер на парозе працы, якую трэба правесці з дзяржавамі, якіх мы разглядаем як патэнцыйных кандыдатаў на атрыманне статуса назіральніка ці партнёра Арганізацыі дагавора аб калектыўнай бяспецы», — паведаміў журналістам Станіслаў Зась.

На яго думку, акрэсленне такіх краін і наладжванне работы з імі дапаможа сфарміраваць пояс добрасуседства вакол ваенна-палітычнага блока.

«Беларусь вельмі шчыльна ўцягнутая ў дзейнасць АДКБ. Адчуваецца падтрымка на ўсіх кроках, якія накіраваны на ўмацаванне гэтай арганізацыі і павышэнне эфектыўнасці яе працы ў інтарэсах усіх краін», — аддаў належнае Генеральны сакратар.

❍ У тэму

«ЛІЧЫМ ВАЖНЫМ НАЛАДЖВАЦЬ ДЫЯЛОГ З НАТА»

Сярод абмеркаваных з Прэзідэнтам Беларусі тэм Станіслаў Зась вылучыў міратворчую дзейнасць. У гэтым плане прасунулася супрацоўніцтва з ААН па прыцягненні нашага міратворчага патэнцыялу і ўключэнні яго ў практычныя місіі арганізацыі.

«Безумоўна, такі практычны крок садзейнічаў бы павышэнню аўтарытэту і эфектыўнасці арганізацыі», — сказаў генеральны сакратар АДКБ і дадаў, што арганізацыя ў гэтым напрамку атрымлівае падтрымку Беларусі і кіраўніка краіны.

Добрыя адносіны склаліся з АБСЕ. У маі назначана сустрэча з генеральным сакратаром арганізацыі. Адбываецца плённае партнёрства з СНД, ШАС.

«З НАТА адносіны пакуль ніяк не складваюцца. Але адпаведныя сігналы і гатоўнасць мы абазначаем і лічым важным наладжваць дыялог з гэтым ваенна-палітычным блокам, таму што і адзін блок, і другі займаюцца пытаннямі бяспекі ў розных рэгіёнах. Трэба такую камунікацыю наладжваць», — паведаміў Станіслаў Зась.

Чарговы саміт АДКБ адбудзецца ў снежні ў Маскве. Расія ў гэтым годзе старшынствуе ў Саюзе.

Марыя ДАДАЛКА, Варвара МАРОЗАВА.

❍ ДАВЕДКА

Пад увагай АДКБ (членамі з'яўляюцца шэсць краін — Беларусь, Расія, Казахстан, Арменія, Кыргызстан і Таджыкістан) шматлікія вектары — контртэрарыстычная, антынаркатычная работа, спыненне нелегальнай міграцыі, сумесныя вучэнні і мемарыяльныя мерапрыемствы.

Да 75-годдзя Перамогі прымеркавана сустрэча вышэйшых асоб АДКБ, СНД, ШАС у красавіку ў Маскве. Ваеннаслужачыя Беларусі пачалі падрыхтоўку да ўдзелу ў парадзе ў Маскве 9 мая.

Для надання імпульсу сумеснай барацьбе з выклікамі запланавана антынаркатычная аперацыя «Канал», аперацыя па спыненні нелегальнай міграцыі грамадзян трэціх краін і асоб без грамадзянства «Нелегал».

Сёлета запланаваны сем сумесных вучэнняў з войскамі калектыўных сіл — «Узаемадзеянне-2020», «Пошук-2020», «Эшалон-2020» (у Арменіі), «Рубеж» (на тэрыторыі Кыргызстана), «Непарушнае братэрства-2020» (Беларусь), «Кобальт-2020» (у Таджыкістане) і спецыяльнае вучэнне з выратавальнымі падраздзяленнямі МНС.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Ва Украіне абралі новы ўрад

Вярхоўная Рада на пазачарговым пасяджэнні зацвердзіла склад новага ўрада, які прапанаваў абраны прэм'ер Дзяніс Шмыгаль. Трансляцыя галасавання вялася на YouTube-канале парламента. Змянілася 10 міністраў. Свае пасады захавалі толькі чацвёра чыноўнікаў. Гэта віцэ-прэм'ер па лічбавай трансфармацыі Міхаіл Фёдараў, кіраўнік МУС Арсен Авакаў, міністр інфраструктуры Уладзіслаў Крыклій і міністр юстыцыі Дзяніс Малюська. Акрамя самога Шмыгаля, які раней быў віцэ-прэм'ерам і міністрам развіцця суполак і тэрыторый, яшчэ два міністры засталіся ва ўрадзе, але змянілі пасады. Кіраўнік МЗС Вадзім Прыстайка стаў віцэ-прэм'ерам па еўраатлантычнай інтэграцыі, а Дзмітрый Кулеба, які займаў гэтую пасаду, узначаліў знешнепалітычнае ведамства. Ва ўрадзе з'явіліся два новыя крэслы — міністр спорту і моладзі, а таксама міністр сельскай гаспадаркі. За адстаўку былога прэм'ера Аляксея Ганчарука прагаласавалі 353 з 423 дэпутатаў. Прэзідэнт Уладзімір Зяленскі заявіў, што Кабмін не вырашыў праблем з пенсіямі, камунальнымі плацяжамі, даўгамі па заробках і дэфіцытам бюджэту.

Створаны кібернетычныя сілы Еўрасаюза

Шэсць еўрапейскіх дзяржаў на чале з Літвой заснавалі кібернетычныя сілы ЕС хуткага рэагавання. Як паведаміла агенцтва BNS, мемарандум аб пагадненні таксама падпісалі Эстонія, Харватыя, Польшча, Нідэрланды і Румынія. Гэта адбылося напярэдадні ў Заграбе, дзе прайшла нефармальная сустрэча міністраў абароны ЕС. У адпаведнасці з пагадненнем, у розных краінах будзе несці дзяжурства міжнародная каманда, гатовая ў любы час рэагаваць на кібератакі. Такая каманда, сфарміраваная з цывільных і ваенных удзельнікаў, у выпадку небяспечнага кіберінцыдэнта віртуальна, а ў выпадку неабходнасці і фізічна падключыцца да яго ліквідацыі і расследавання. Статус назіральнікаў атрымалі Бельгія, Грэцыя, Іспанія, Італія, Францыя, Славенія і Фінляндыя.

У Егіпце змяняюцца візавыя правілы для турыстаў

Новыя правілы ўезду і знаходжання замежных турыстаў у Егіпце, якія павялічваюць да 90 дзён дапушчальны тэрмін знаходжання ў краіне і ўводзяць новую пяцігадовую візу, уводзяцца з 1 чэрвеня. Пра гэта ТАСС паведамілі ў егіпецкім урадзе. Адпаведнае рашэнне было прынята на пасяджэнні міністэрскай камісіі па турызме пры ўрадзе Федэрацыі турыстычных палат. «У мэтах заахвочвання турызму і развіцця інвестыцый у турыстычны сектар краіны прынята рашэнне павялічыць да 46 колькасць краін, грамадзяне якіх маюць права атрымліваць візу на граніцы», — паведамілі ў кабінеце. Акрамя таго, у перыяд летніх месяцаў — з чэрвеня да жніўня — турыстам, якія прыбываюць непасрэдна ў аэрапорт Луксора, будзе зроблена зніжка — 10 долараў на візу. Як вядома, цяпер цана аднаразовай турыстычнай візы складае $25, шматразовай — $60.

Прэзідэнт уручыў Валянціне Мацвіенка Ордэн Францыска Скарыны

Сустрэчы ў Палацы Незалежнасці звычайна адбываюцца раніцай, але бываюць і ўвечары. Нячаста, нават рэдка. Учора, акрамя Станіслава Зася, наведала рэзідэнцыю Прэзідэнта Беларусі старшыня Савета Федэрацыі Расіі Валянціна Мацвіенка.

Чаму сустрэча запланавана на вечар, зразумела. У праграме яе візіту ў Мінск — перамовы і ў Савеце Рэспублікі, і ў Палаце Прадстаўнікоў *(аб гэтым падрабязна — у сённяшнім выпуску «Мясцовага самакіравання»)*. Але рабочую атмасферу насычанага перагаворамі дня ўпрыгожыў падарунак для шаноўнай госці, які чакаў яе амаль год.

«Я хачу скарыстацца выпадкам вашага візіту і ўручыць вам заслужаную ўзнагароду», — сказаў Прэзідэнт, дадаўшы: «Мы хацелі, каб гэта было ўрачыста і па-роднаму, блізкаму. У кабінеце я не ўручаю *(узнагароды — «Зв».)* нікому, акрамя сваіх сяброў».

Валянціна Мацвіенка падкрэсліла: «Гэта вельмі дарагая ўзнагарода». «Я з асаблівымі пачуццямі заўсёды прыязджаю да вас і ад'язджаю, зарадзіўшыся гэтай вашай цеплынёй, гасціннасцю», — звярнула ўвагу расійскі парламентарый.

Аляксандр Лукашэнка падарыў таксама спікеру Савета Федэрацыі ікону святой Валянціны Мінскай і кнігу з рэцэптамі беларускай кухні.

Валянціна Мацвіенка падзякавала сваёй каляжанцы Наталлі Качанавай, старшыні Савета Рэспублікі за выдатную праграму сустрэчы: «Мы сёння наведалі Храм-помнік у гонар Усіх святых, і я прывезла капсулу з ржэўскай зямлёй. Вы ведаеце, што пад Ржэвам была самая кровапралітная і працяглая бітва. Такая чуллівая была цырымонія. І я рада, што частка гэтай зямлі, палітай крывёй і рускіх, і беларусаў, і іншых народаў будзе захоўвацца ў вашым храме. Асабліва гэта знамянальна ў год 75-годдзя Перамогі».

Марыя ДАДАЛКА.

Блізкая ўлада

Размова перад святам

Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, паператорчасці, а таксама для аператыўнага рашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі ў суботу 7 сакавіка з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;
- старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Вікенцевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Парламенцкі дзённік

ЦЭНТРАЛЬНАЕЎРАПЕЙСКІ ВЕКТАР: АД БЕРАГОЎ ДНЯПРА ДА ДУНАЯ

Тавараабарот Беларусі і Венгрыі ў мінулым годзе вырас на 30 працэнтаў

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка сустрэўся з міністрам замежных спраў і знешнеэканамічных сувязяў Венгрыі Петрам Сійяртам. Па словах спікера беларускага парламента, сустрэча яшчэ раз пацвярджае імкненне дзвюх краін устанавіць доўгатэрміновае ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва.

«Мы як дэпутаты Рэспублікі Беларусь лічым, што нам трэба пашыраць наша ўзаемадзеянне, знаходзіць новыя формы і метады. Лічым, што нам трэба супрацоўнічаць таксама ў рамках Вышаградскай групы, Еўрапейскага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза. Вы ведаеце, што старшынства ў гэтым саюзе са студзеня перайшло да Рэспублікі Беларусь», — акцэнтаваў увагу старшыня ніжняй палаты беларускага парламента.

Добрыя палітычныя адносіны краін з'яўляюцца падмуркам для развіцця і гандлёва-інвестыцыйнага партнёрства. У студзені мінулага года Петэр Сійярта ўжо наведваў з афіцыйным візітам Беларусь. Тады перагаворы з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам і міністрам замежных спраў Уладзімірам Макеем прайшлі плённа — быў падпісаны шэраг дакументаў аб партнёрстве, у тым ліку міжурадавае пагадненне аб абароне інвестыцый, мемарандум аб рэгіянальным супрацоўніцтве.

«Гэтыя крокі ўжо далі вельмі добры вынік. Вы ведаеце, што за 2019 год у нас тавараабарот вырас на 30 працэнтаў і дасягнуў 253 мільёнаў долараў. Гэта вельмі добры паказчык», — паведаміў Уладзімір Андрэйчанка.

Марыя ДАДАЛКА.

На слыху

ВІРУС УТАЙМАВАНЫ

Шасцярых пацыентаў хутка выпішуць: яны не заразныя

Шасцёра пацыентаў, у якіх былі выяўлены станоўчыя тэсты на каранавірус, адчуваюць сябе здавальняюча і па стане здароўя могуць быць выпісаны са стацыянара менавіта зараз, паведамілі ў Міністэрстве аховы здароўя.

— Скаргаў няма, павышанай тэмпературы няма. Але згодна з пратаколам, неабходна атрымаць двойчы адмоўны лабараторны тэст, які пакажа адсутнасць РНК віруса ў клетках слізістых. На працягу выхадных — у пачатку наступнага тыдня — пасля атрымання гэтых лабараторных даных пацыенты будуць выпісаны, — расказала **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.**

Назіранне за 91 чалавекам з ліку тых, хто знаходзіўся ў блізкім коле кантактавання з захварэлымі, працягваецца. Усе змешчаныя на каранцін студэнты БНТУ адчуваюць сябе здавальняюча. На сёння ні ў кога з іх РНК каранавіруса не выяўлена.

Адпушчаны дадому шэсць студэнтаў і выкладчык з кантактаў «другога кола», якія паступалі ў бальніцы з пачырваненнем горла ці іншымі прыкметамі вострай рэспіраторнай інфекцыі. У іх каранавірусная інфекцыя не пацвердзілася.

— Плануецца, што пры адсутнасці дадатковых даных аб распаўсюджанні інфекцыі сярод студэнтаў на наступным тыдні БНТУ зможа прыступіць да звычайнага вочнага рэжыму працы, — пракаментавала Юлія Барадун. — Выкладчыкам будуць закрыты лісткі непрацаздольнасці, студэнтам выдадуць даведкі. Усе змогуць працягваць навучальны працэс.

Цяпер пад медыцынскім назіраннем знаходзіцца 1 322 чалавекі, якія прыбылі з эпідэміялагічна неспрыяльных рэгіёнаў. За гэты перыяд 1 135 чалавек зняты з назірання, бо ў іх няма ніякай клінічнай карціны і прайшоў інкубацыйны перыяд.

Алена КРАВЕЦ.

БУДЗЕМ МЕЦЬ СВАІХ КРЭВЕТАК

Стаўка на стронгу

Так, няма ў нас выхаду да мора. Значыць, трэба больш здабываць або вырошчваць. Таму Мінсельгасхарч сумесна з зацікаўленымі ведамствамі распрацаваў комплекс мер па развіцці рыбаводства да 2025 года. Упор робіцца на вытворчасць каштоўных відаў рыб, у прыватнасці стронгі.

Прадугледжваецца будаўніцтва трох комплексаў у Магілёўскай вобласці, кожны з якіх мае магутнасць адну тысячу тон, а таксама будаўніцтва асятровай гаспадаркі ў Мінскай вобласці. У цэлым да 2025 года запланавана наладзіць вытворчасць 4,5 тысячы тон рыб каштоўных парод у год. «Да таго часу магутнасць вытворчасці каштоўнай рыбы павялічыцца як мінімум у пяць разоў, — адзначыла Вольга Барэйша. — У першую чаргу гэта стронга і асетр, а таксама сямейства сомавых».

Шчупака — у Польшчу, рыбныя кансервы — у Кітай

А ўсё ж такі ўмеем мы рабіць з нашай рыбкі ўсякія прысмакі. **Начальнік аддзела маркетынгу і продажаў ДА «Белводгас» Ірына ГАЛАБОКАВА** адзначыла, што рыбгасы аб'яднання за год рэалізавалі 6587,9 тоны рыбы і прадуктаў яе перапрацоўкі, што на 9 працэнтаў больш за ўзровень 2018 года.

Летась сума экспарту прадукцыі ААТ «Рыбгас «Сялец» склала 562 тысячы долараў. Больш за 62 тоны жывога карпа адправілі ў Літву, тры тоны шчупака звычайнага — упершыню — у Польшчу. На экспарт таксама паступалі такія каштоўныя віды рыб, як таўсталобік, белы амур, бялуга. У Расію экспартавалі дзве тоны сцерлядзі і асятра, 242 тоны карпа. А яшчэ стронгавая гаспадарка «Лохва» прадала замежнаму кліенту 27 тон малькоў стронгі.

«Мы рэалізоўваем рыбу як у жывым, так і ў перапрацаваным выглядзе. За 2019 год перапрацавана больш за 1,7 тысячы тон. У нас ёсць шырокі асартымент вэнджанай, вэнджана-вяленай прадукцыі, розныя віды разбірання рыбы. На рыбакамбінаце «Любань» уведзена кансервавая вытворчасць магутнасцю 10 млн бляшанак у год. Ужо асвоена 20 новых відаў кансерваў, хутка яны з'явяцца і ў Мінску», — удакладніла прадстаўнік Белводгаса.

Яна патлумачыла, што нядаўна на адну з кітайскіх выставачных пляцовак былі адпраўлены першыя ўзоры любанскіх кансерваў. Праўда, пасля ўвядзення каранціну магчымасці яе экспанаваць пакуль няма. «Пасля яго зняцця кансервы паступяць на выстаўку, каб спажывец мог іх паглядзець, звярнуць на іх увагу, — удакладніла Ірына Галабокава. — У прадпрыемстваў нашага аб'яднання, на жаль, пакуль няма дазволу на пастаўкі. Мы будзем праходзіць сертыфікацыю, цяпер актыўна займаемся гэтым пытаннем».

Для кітайскага рынку рыбныя кансервы — прадукт незвычайны. Таму разам з прадукцыяй будуць прадстаўлены поўнае тэхналагічнае апісанне вытворчасці і рэцэпты страў.

Замест антыбіётыкаў — прабіётыкі

Навукоўцы перш за ўсё накіраваны на рэсурсазберажэнне і павышэнне эканамічнай эфектыўнасці рыбаводства ў нашай краіне, кажа **намеснік дырэктара па навуковай рабоце РУП «Інстытут рыбнай гаспадаркі НАН Беларусі» Уладзімір КАСТАВУСАЎ.**

Асноўныя распрацоўкі накіраваны на зніжэнне выдаткаў пры вырошчванні рыбы ў сажалках, на кармленне, а таксама на павышэнне выжывальнасці і жыццястойкасці, прадухіленне захворванняў. За год зацверджана пяць тэхнічных умоў для такіх ноу-хау.

Частка з іх накіравана на фарміраванне натуральнай кармавой базы, частка на зніжэнне выдаткаў на корм дзякуючы замене дарагіх імпартных кампанентаў збожжам і рыбнымі крупамі. Напрыклад, камбікорм з прабіётыкамі створаны для прадухілення захворванняў, найбольш небяспечных пры вырошчванні рыбы. Распрацаваны таксама прэпарат для барацьбы з гельмінтамі. Уладзімір Каставусаў падкрэсліў, што навукоўцы імкнуцца сысці ад выкарыстання антыбіётыкаў да прабіятычных прэпаратаў з аналагічнымі эфектамі.

Дарэчы, на набыццё камбікармоў для рыбгасаў з дзяржбюджэту летась было выдзелена сем мільёнаў рублёў. Акрамя таго, сродкі даваліся на лячэбна-прафілактычныя мерапрыемствы і вапнаванне вадаёмаў.

Яшчэ адзін важны аспект якасці рыбных паўфабрыкатаў — якасць самой рыбы. Калі палачкі, біточкі і іншыя катлеты вырабляюць непадалёк ад месца вылаву, гэта, вядома, добра. Але ж Беларусь знаходзіцца далёка ад мора.

Прыблізна 70 % марской прадукцыі, — якая завозіцца ў нашу краіну, гэта рыба глыбокай замарозкі, кажа Уладзімір Каставусаў. Вядома ж, яна саступае свежаму ўлову. Пры гэтым на практыцы нярэдка здараецца так, што тэхналогія замарозкі не выконваецца і ўлоў дамарожваецца ў працэсе захоўвання або транспарціроўкі. Гэта, мякка кажучы, не вельмі добра, бо пры мінус 18 градусах толькі 90 % звязанай вады ў рыбе крышталізуецца. У астатніх 10 % працягваецца раскладанне тлушчаў і дэнатурацыя бялкоў. Чым даўжэй гэты працэс доўжыцца, тым ніжэйшая якасць прадукцыі. Вывад адзін: больш трэба есці мясцовай рыбы.

Вясновае зарыбленне — на месяц раней

Сёлета лёд так і не скаваў большасць вадаёмаў. **Галоўны спецыяліст упраўлення па аквакультуры і рыбалоўнай гаспадарцы ДА «Белводгас» Анатоль НОВІК** назваў і станоўчыя, і адмоўныя вынікі такой анамаліі надвор'я.

Калі павышаецца тэмпература, рыба актыўней рухаецца ў закрытым вадасховішчы і губляе вагу. Гэта рыбаводам нявыгадна. Аднак больш ранняя вясна дазволіць раней пачаць падкормліваць насельнікаў сажалак, і гэта часткова кампенсуе страты.

Дырэктар ААТ «Рыбгас» Волма» Аляксандр КУЛІКОЎСКІ нагадаў, што некалькі дзесяцігоддзяў таму было прынята рэалізоўваць рыбу толькі восенню, у лістападзе. У сучасных умовах яе ловяць і прывозяць у гандлёвыя пункты круглы год. У сувязі з гэтым зімой звычайна рыбгасы вымушаныя забяспечваць праточнасць зімавальных сажалак і дадатковую аэрацыю. Каб вылавіць рыбу ў мароз, трэба выпілоўваць палонку, гэта патрабуе дадатковых працоўных і эканамічных выдаткаў. А няма лёду — значыць сэканомілі.

Сёлета, як чакаецца, тэмпературны рэжым дазволіць правесці зарыбленне раней і разгрузіць зімавальныя сажалкі. Плануецца, што яго пачнуць ужо ў сакавіку, хоць звычайна гэта адбываецца не раней за красавік.

Сяргей КУРКАЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Надвор'е

КРАСАВІК АДМЯНЯЕЦЦА,

бо сакавік на двары і марозік уначы

А як усё цёпла пачыналася! У першай палове тыдня тэмпературны фон у краіне на 7—11 градусаў перавышаў кліматычную норму і адпавядаў першай палове красавіка. На многіх метэастанцыях краіны 3 сакавіка былі абноўленыя рэкорды дня.

У бліжэйшыя дні на большай частцы тэрыторыі пройдуць халодныя дажджы, часам з мокрым снегам, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

На выхадныя на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. Толькі ўдзень 8 сакавіка атмасферны ціск падрасце і аблокаў з ападкамі стане менш. Месцамі прагназуюцца туманы. Вецер у гэты дзень будзе ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 1 да 8 градусаў з плюсам, удзень будзе дастаткова камфортна — 7—14 градусаў цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. У асобных раёнах пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі прагназуюцца слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, днём паветра прагрэецца ад плюс 5 да 12 градусаў цяпла.

Сяргей КУРКАЧ

Класныя навіны

ПУЦЁЎКА Ў ОКСФАРД

Кампанія МТС аб'яўляе пра старт конкурсу для вучняў 10-11 класаў «MobiКвіз».

— Мы не першы год ладзім конкурсы для школьнікаў. Сумесна з Міністэрствам адукацыі імкнёмся падтрымаць юных інтэлектуалаў, у якіх ёсць цікавасць да сферы сучасных тэхналогій. Фармат «MobiКвіза» дазволіць кожнаму ўдзельніку праверыць сваю эрудыцыю, — падкрэслівае **кіраўнік камерцыйнага дэпартамента кампаніі МТС Мікалай БУЛАШ.**

«МобіКвіз» будзе складацца з серыі інтэлектуальных гульняў. Адборачныя этапы пройдуць ва ўсіх абласных гарадах Беларусі з сакавіка да мая. Пераможцы рэгіянальных тураў прыедуць у Мінск на паўфінал. Гульцоў камандаў, якія перамаглі, чакае індывідуальнае выпрабаванне: у фінальным туры яны будуць змагацца паміж сабой.

Пытанні ва ўсіх турах інтэлектуальнай гульні будуць датычыцца тэхналогій, інавацый, інтэрнэту, мабільнай сувязі, а таксама літаратуры і гісторыі. Для перамогі падлеткам спатрэбяцца не толькі веды, але таксама лагічнае мысленне і ўменне знаходзіць правільныя аргументы.

Пераможца, які правільна адкажа на большасць пытанняў у фінале «MobiКвіза», атрымае мэтавую стыпендыю на навучанне на моўных курсах у Оксфардзе (Вялікабрытанія).

Першы адборачны этап пройдзе ў Брэсце 7 сакавіка. Для таго каб стаць удзельнікам конкурсу, неабходна сабраць каманду з сямі чалавек, прайсці рэгістрацыю і ў прызначаны час прыйсці на гульню.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Анонс

Год малой радзімы: айчыннае кнігавыданне

У кнігарні «Светач» 11 сакавіка пройдзе святочная імпрэза пад назвай «Кніжны свет Беларусі: Берасцейшчына».

Год малой радзімы, тыя сацыяльныя, эканамічныя, грамадска-асветніцкія праекты, якія сарыентаваны на развіццё рэгіёнаў краіны, наклалі свой адбітак і на праблематыку кнігавыдавецкай дзейнасці. Часцей сталі прыходзіць да чытача краязнаўчыя кнігі, павялічылася колькасць мерапрыемстваў, звязаных з прэзентацыяй такога характару выданняў.

«Кніжны свет Беларусі: Берасцейшчына» збярэ на пляцоўцы кнігарні «Светач» кнігавыдаўцоў, пісьменнікаў, краязнаўцаў, бібліятэкараў, фотамайстроў, прадстаўнікоў інстытутаў улады і грамадскасці з Брэста і Брэсцкай вобласці. Размова пойдзе пра найлепшыя, найбольш адметныя кнігі, якія ў 2019 годзе і раней сталі сапраўднымі падзеямі, знайшлі шырокі розгалас сярод чытачоў, аказаліся запатрабаваныя і да 1000-годдзя Брэста, і ўвогуле ў справе вывучэння гісторыі роднай старонкі.

Мяркуецца, што ўдзел у імпрэзе «Кніжны свет: Берасцейшчына» возьмуць вядомыя беларускія пісьменнікі Леанід Дранько-Майсюк, Раіса Баравікова, Алесь Бадак, Анатоль Бензярук, якія нарадзіліся на брэсцкай зямлі і сваімі памкненнямі звязаны з гэтым багатым на гісторыю краем. На «берасцейскім святе» ў «Светачы» будуць прэзентаваны «Берасцейская Біблія», энцыклапедыя «Брэст. 1000 гадоў», фотаальбом «Кветкавы край Беларусі», які прысвечаны Давыд-Гарадку, іншыя энцыклапедычныя, даведачныя, краязнаўчыя выданні.

Арганізатары імпрэзы — ААТ «Белкніга», выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», Міністэрства інфармацыі — плануюць прадставіць у «Светачы» і кніжныя краязнаўчыя набыткі, прысвечаныя іншым рэгіёнам нашай краіны.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Аздараўленне-2020

Генадзь БАЛБАТОЎСКІ:

«Даступнасць пуцёвак будзе высокай»

Сёлета колькасць дзіцячых аздараўленчых летнікаў у краіне павялічыцца. Адпаведна, адпачыць у іх зможа большая, чым летась, колькасць дзяцей. Вырасце і дзяржаўная датацыя на пуцёўкі, што зробіць іх максімальна даступнымі. Якой будзе сёлетняя дзіцячая летняя аздараўленчая кампанія, а таксама наколькі вырасце цана пуцёвак у санаторыі для дарослых і якія з іх самыя папулярныя, расказаў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.

Датацыі павялічацца

Прыёмка стацыянарных летнікаў пачнецца ў хуткім часе. У 2020 годзе іх колькасць вырасце са 143 да 146.

— Адносна нядаўна мы закрывалі па 20—25 летнікаў, а сёлета наадварот, іх колькасць павялічыцца. Два летнікі ўвядуць у строй пасля рэканструкцыі, яшчэ адзін акрыецца на базе закрытай школы, якая знаходзіцца ў добрым стане, у экалагічна чыстай сельскай мясцовасці, — расказаў Генадзь Балбатоўскі. — Усяго ў краіне ў летні перыяд будзе працаваць больш за 6200 летнікаў усіх тыпаў. Па аб'ёмах аздараўлення мы ставім амбіцыйныя задачы — плануем за лета аздаравіць 394 тысячы дзяцей.

Фінансавыя сродкі на гэтыя мэты паступілі з бюджэту і фонду сацыяльнага страхавання ў поўным аб'ёме. Плануецца выкарыстаць 50 мільёнаў рублёў, і гэтага хопіць як на аздараўленне названай колькасці дзяцей, так і на падрыхтоўку летнікаў да сезона.

— На падрыхтоўку летнікаў і ўмацаванне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы летась затрачана 18 мільёнаў рублёў, у 2018-м — 11 мільёнаў. Радуе, што з году ў год гэта лічба расце і што ўласнікі ўкладаюць свае сродкі ў развіццё дзіцячых аздараўленчых устаноў, — адзначыў дырэктар цэнтра. — Плануем, што ў 2020-м колькасць сродкаў не зменшыцца.

Дзяржаўныя датацыі на дзіцячыя пуцёўкі ў летнікі ўсіх тыпаў павялічацца сёлета на 5 %. Дзяржаўная дапамога ў летнік з кругласутачным знаходжаннем складзе 206 рублёў (летась — 196).

— Значнага росту цэн не прагназуецца, даступнасць пуцёвак для бацькоў будзе высокай, — рэзюмаваў суразмоўца.

Генадзь Балбатоўскі нагадаў, што за 2019 год аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне прайшлі 719 тысяч дзяцей.

— Мінулагодняя летняя кампанія стала знакавай: мы ахапілі 41,5 % дзяцей школьнага ўзросту. Мы даўно не выкарыстоўваем планавы метад, а працуем па заявачным прынцыпе — усе ахвотныя і тыя, хто мае патрэбу, атрымліваюць пуцёўкі.

Кошт вырас на адзін рубель

— За першыя два месяцы 2020 года мы назіраем станоўчыя тэндэнцыі: на 2 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася запаўняльнасць санаторыяў, захоўваецца попыт на пуцёўкі, павялічваецца глыбіня продажаў. Калі вы хочаце паехаць у санаторый летам, дзейнічаць трэба ўжо цяпер. Напрыклад, у «Юнацтва» на лета ўжо ўсё прададзена, — дзеліцца дырэктар цэнтра.

Пакуль цана на суткі ў двухмесным нумары стандартнай якасці выраслa на 1 рубель. Калі летась пражыванне ў сярэднім каштавала 57 рублёў 60 капеек, то цяпер 58 рублёў 70 капеек.

— Канешне, да лета цэны яшчэ падрастуць, але нязначна — у межах 5 %. Сёння пуцёўкі на лета рэалізуюцца з разліку 60 рублёў у суткі.

Генадзь Балбатоўскі адзначыў, што найбольшым попытам карыстаюцца санаторыі з найлепшай матэрыяльна-тэхнічнай базай — першай і вышэйшай катэгорый. Але і санаторыі больш нізкага класу знаходзяць сваіх спажыўцоў. Пры гэтым розняцца і цэны. Кошт нумароў «люкс» у брэндавых санаторыях можа даходзіць да 200 рублёў у суткі. У санаторыях з мінімальным наборам аздараўленчых паслуг сутачнае пражыванне каштуе 30—40 рублёў.

Сярод самых сучасных санаторыяў эксперт вылучыў «Альфа Радон» і «Пліса». Яны былі ўзведзены самымі апошнімі.

— Санаторыі пабудаваны з нуля, створана сучасная інфраструктура. Там ёсць свае мінеральныя воды і сапрапелевыя гразі. І яны шырока гэта прымяняюць. Запаўняльнасць пад 100 % ім не патрэбна. Яна складае каля 70 %, і за кошт больш высокай цаны гэта сябе апраўдвае.

Летась у Беларусі адпачыла 242,5 тысячы замежнікаў. Каля 80 % з іх расіяне. Але апошнім часам штогод іх колькасць крыху змяншаецца. Затое цікавасць да беларускіх санаторыяў, якія знаходзяцца ў бязвізавай зоне ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях (на сёння іх 10), праяўляюць грамадзяне з Заходняй Еўропы. У тых санаторыях, якія ва ўмовах «бязвізу» працуюць ужо год, выручка ад экспарту павялічылася ўдвая.

Алена КРАВЕЦ.

❍ Рэкорды 2019-га

У цэлым у 2019 годзе санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне ў краіне прайшло 1 389 тысяч чалавек. Год стаў рэкордным не толькі па колькасці тых, хто адпачыў у беларускіх здраўніцах, але і па іх запаўняльнасці — у сярэднім за год 84 %. Павялічылася колькасць пуцёвак у свабоднай рэалізацыі — было прададзена 495 тысяч, выручка склала 460 мільёнаў рублёў. За кошт сродкаў бюджэту і фонду сацыяльнага страхавання адпачыла больш за 794 тысячы чалавек. Больш за 80 % гэтых сродкаў накіравана на дзіцячае аздараўленне.

Але і дарослыя (як тыя, хто працуе, так і тыя, хто атрымлівае пенсіі і дзяржаўныя дапамогі), якія мелі медыцынскае права на аздараўленне, змаглі яго рэалізаваць.

«ЗОРНАЕ» ЖЫЦЦЁ ДЗЯНІСА БУРКЕВІЧА

Сапраўдны Воін

— Я просты вясковы хлопец, вырас у пасёлку Новапалескі Салігорскага раёна. Бацькі трымалі ў гаспадарцы шмат свойскай жывёлы. Так што, любоў да ўсяго жывога ў мяне з дзяцінства. Пасля школы адвучыўся ў Мінскім машынабудаўнічым каледжы, адслужыў у войску. Уладкаваўся ў Маладзечанскі аддзел Дэпартамента аховы МУС. Калі прапанавалі быць кінолагам, я пагадзіўся, але пры адной умове, што куплю свайго сабаку. Так у мяне з'явілася нямецкая аўчарка Фіёна, з якой правялі шмат затрыманняў. Вопыту работы з «братамі меншымі» ў мяне не было. Веды спасцігаў на курсах і самастойна, удзельнічаў у розных міжнародных семінарах. На адным з іх пазнаёміўся з Віталем Новікам. Ён таксама кінолаг, дрэсіроўшчык, гаспадар Воіна, які і сыграў ролю Мухтара. Віталю першаму прапанавалі здымкі са сваім сябрам. Дарэчы, нядаўна Воіна не стала, загінуў ад анкалагічнага захворвання. Менавіта загінуў, а не памёр. Такіх сабак, як ён, мабыць, у «Мухтары» больш не здымалася. Воін валодаў адмысловымі рабочымі якасцямі, быў вельмі кемлівым, ведаў шмат трукаў. У яго па пашпарце надта доўгая арыстакратычная нямецкая мянушка, якую цяжка вымавіць, таму ўся здымачная група называла яго Воінам. Віталь папрасіў мяне вымуштраваць сабаку на затрыманні. Так і пачалося маё «зорнае» жыццё, — смяецца суразмоўнік.

Зямныя людзі

Вядома, напярэдадні дэбюту Дзяніс Буркевіч вельмі хваляваўся. Сваіх герояў, якімі захапляўся, ён бачыў у серыяле, калі яшчэ быў зусім малы. Але прынялі яго вельмі цёпла. Аляксей Маісееў, Уладзімір Фякленка, Святлана Бруханава аказаліся сціплымі, простымі, зямнымі людзьмі, без ніякай зорнай хваробы. «Аднойчы невядомы нікому пачынаючы акцёр адмовіўся падаць на зямлю, маўляў, пакладзіце мне посцілку. І Уладзімір не вытрымаў, зняў куртку і кінуў на траву. У акцёраў, якія выконвалі галоўныя ролі, не было ніякага райдара. Мы ўсе разам пілі каву з аднаго кубка, — кажа Дзяніс. — З Лёшам і Валодзем сябруем да гэтага часу. Я прывозіў на здымачную пляцоўку знаёмых бабулек. Іх заўсёды прыязна, з павагай сустракалі галоўныя героі серыяла. Нават, калі па секундах распісаны кожны дубль, яны знаходзілі час, каб пагутарыць з імі, сфатаграфавацца, выпіць кавы, запрасіць у грымёрку. З дзецьмі ўсё складаней. У малых яшчэ ёсць вера ў Дзеда Мароза. І калі яны бачылі, што гэта пастаноўка, то многія пачыналі плакаць. Маўляў, гэта не сапраўдны Мухтар. Атрымлівалася, што я неасэнсавана разбіваў дзіцячыя мроі. Таму і перастаў браць іх на здымкі».

Як адна каманда

— Якімі якасцямі павінен валодаць медыйны сабака? — пацікавілася ў Дзяніса.

— Яны праходзяць строгі адбор. Улічваецца знешні выгляд, уменне выконваць розныя трукі. Рэжысёр, як вядома, творчы чалавек. І падчас здымак яму можа прыйсці ідэя, непрадугледжаная сцэнарыем. Маўляў, хачу каб Воін прынёс кубак з вадою аднаму з акцёраў і аднёс яго назад на стол. Мы з Віталем працавалі за камерай, жэстамі аддавалі каманды. І Воін выдатна справіўся з заданнем. Таму вельмі важна, каб сабака разумеў мову жэстаў, што ад яе патрабуюць. Напрыклад, можна брахаць, але не кусацца.

Наогул, знайсці для фільмаў чатырохногіх артыстаў не так проста. Сабакі павінны быць добра дрэсіраваныя, умець шчыльна працаваць з чужымі людзьмі, нягледзячы на тое, што прывыклі да сваіх уладальнікаў. Працаваць як адна каманда. А на працэс прывыкання адводзіцца няшмат часу. У «Мухтары» здымалася дзве-тры сабакі. Напрыклад, адзін тыдзень — адна, другі — іншая, так званымі на прафесійнай мове блокамі. Таму што здымачны дзень працягваецца па 12—16 гадзін. Людзі валіліся з ног. А што казаць пра сабаку. Ён моцна стамляецца ад цяжкай работы, становіцца непаслухмяным. Падчас здымак прысутнічае і падменны сабака на той выпадак, калі што здарыцца, напрыклад, «калега» параніцца, выйдзе са строю. Хоць адну ролю ігралі розныя сабакі, іх немагчыма было адрозніць аднаго ад другога. Падбіралі іх па масці, часам даводзілася і падфарбоўваць, каб схаваць нейкія адметнасці.

— А ці не было спакусы самому зняцца ў нейкай ролі? — запытала ў Дзяніса.

— Так, аднойчы звярнуўся да рэжысёра, каб паказалі і маю асобу ў фільме. Сын расказа ў дзіцячым садку, што бацька ўдзельнічае ў здымках «Мухтара», а яму ніхто не паверыць. І мяне паказалі на галоўнай застаўцы разам з акцёрамі. Мая мама сабрала жанчын з усёй вёскі, каб пабачылі, як Мухтар выбівае пісталет з рук сына. Затым папрасіў, каб далі мне хоць маленькую ролю са словамі. Было вельмі цяжка, пасля гэтага зарокся больш не здымацца. Затым на экране бачыў свае касякі, скаванасць. Наогул, галоўныя героі валодаюць добрай памяццю, яны не завучваюць тэкст на памяць, пераказваюць яго блізка па сэнсе. Ахапіць сотні старонак немагчыма фізічна.

«Салдацік» пасля «Мухтара»

— Дык, з «Мухтара» і пачалася ваша сцэнічная кар'ера?

— Ну, гэта моцна сказана. Менавіта пасля «Мухтара» мяне сталі запрашаць у розныя праекты з удзелам сабак. Іх было шмат: «Салдацік», «Ні кроку назад», «Тошкіна вайна» і іншыя.

У «Салдаціку» мастацкім кіраўніком выступіла народная артыстка Расіі, рэжысёр Ала Сурыкава. Гэта ваенная драма хлопчыка-сіраты, заснаваная на рэальных падзеях. Напярэдадні 23 лютага стужку паказалі ў многіх беларускіх кінатэатрах. 1943-і год, вайна. Па задуме рэжысёра галоўны герой катаецца на запрэжаных у сані сабаках, вывозіць з поля бою раненых. На дарозе сядзіць кот, які ўмываецца. Рэжысёр запатрабаваў, каб назаўтра прынеслі некалькі аднолькавай масці.

— У мяне ёсць падрыхтаваны кот, які справіцца з заданнем, — прапанаваў Дзяніс.

На наступны дзень кінолаг на здымках дастае з чорнай скрыні свайго хатняга мурлыку, ставіць на дарогу. Пакуль той прызвычаіўся да святла, агледзеўся, не разумеючы, дзе ён і што з ім, пусцілі сабак. «Васька» ўцякаць, але няма куды: абапал сцежкі стаяць людзі, а паміж імі калідор. Ён ірвануў па гэтай вузкай прасторы і скокнуў прама на камеру. Шыкоўны атрымаўся дубль.

— Я працаваў з курамі, катамі, шчанюкамі, сабакамі розных парод, ставіў трукі. Гэта не чалавек, які адразу ўсё зразумее. Жывёліну рэдка ўдаецца зняць з першага дубля. Таму акцэнт робіцца на яе, бо чалавека лягчэй перазняць. Аднойчы здымалі такую сцэну ў фільме «Тошкіна вайна». Немец з аўтаматам і аўчаркай на ланцугу вядзе двух палонных, адзін з цялежкай, другі — з рыдлёўкай, да кучы з вугалем, у якой хаваецца партызан. Сабака пачула, што там нехта ёсць і пачала брахаць па камандзе. Гэты эпізод здымалі цэлую гадзіну, рэжысёр крычыць, нервуецца, не атрымліваецца так, як ён хоча. А чатырохлапы ахоўнік усё гаўкае. Не можа зразумець, што зрабіў не так, чаму не даюць пачастунак. І ён кусае аднаго з рабочых за нагу, можа цяпер атрымаю штосьці смачнае. Той курчыцца ад болю, а немец, які не бачыў гэтай сцэны, думае што так трэба па сцэнарыі і трасе яго за карак, маўляў, падымайся, працуй.

На гэты раз пад іклы сябра чалавека Дзяніс не трапіў. У яго і так шмат укусаў. І ён ганарыцца, што 90 працэнтаў з іх — ад легендарнага Воіна.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ПРЫЕХАЎ МУЖ З КАМАНДЗІРОЎКІ

У мінулыя выхадныя мы з дарослай дачкой перабралі дзіцячыя рэчы. Заўважылі, што нашы хлопчыкі (яе сыны, а мае ўнукі) зноў павыраслалі з куртачак і штонікаў. Трэба, значыць, спраўляць ім новыя... Калі дакладней — дык не зусім, бо ў апошні час мы вельмі шмат што купляем у крамах сэканд-хэнд. У перакладзе з англійскай гэта «другія рукі». Мо здараецца, недзе і трэція, але ж з дзіцячым адзеннем яны вельмі выручаюць! Настолькі, што дачка спытала: як гэта мы жылі без іх, гэтых крам, як некалі гадавалі малых?

Прыйшлося расказаць, што дзіцячыя рэчы тады проста перадаваліся ад старэйшых да малодшых у вёсках, у пад'ездах, у сем'ях... (Казалі, напрыклад, што брацікі-сястрычкі — нават стрыечныя, — вырасшы ў адных кашульках ды штоніках, дружней потым жывуць). А для дарослых існавалі так званыя камісіёнкі. Туды можна было нешта здаваць, там можна было нешта купіць. Апроч таго, існавала практыка абменаў...

Нас, вельмі блізкіх, яшчэ школьных сябровак, было, напрыклад, чатыры. Сустракаліся мы не сказаць каб часта — разы два-тры на год, але ж адна з сустрэч (як правіла, вясной) абавязкова прысвячалася бартару. Гэта значыць, што кожная з нас выцягвала са сваёй шафы тое, што ўжо не насіла (стала замалое, завялікае, збрыдзела ці проста не падабаецца), складвала ў сумку і ехала на сустрэчу. Найчасцей мы збіраліся ў нашай Любачкі, бо ў яе і рэчаў было найболей, і кватэра амаль што ў цэнтры.

Дык вось наш чарговы збор. Нехта з сябровак зрабіў селядца пад футрам, нехта «Мімозу» і «Аліўе»... Мне даручылі купіць віно і торцік — у пятніцу вечарам мы ў Любы.

Тут трэба сказаць, што кватэра ў яе была не проста ў цэнтры, але і досыць цікавая па сваёй планіроўцы. Адразу на ўваходзе — прасторная вітальня (злева люстэрка на ўсю сцяну, справа — шырокія дзверы ў спальню з балконам). Далей, адпаведна, дзіцячы пакой і санвузел, а нарэшце — зала і кухня.

Стол мы накрылі якраз там, досыць доўга пасядзелі, павячэралі, пагаварылі, потым успомнілі-такі, чаго сабраліся, і са сваімі кофтачкамі, спадніцамі, шортамі ды сарафанамі выйшлі ў вітальню. А далей кожная з нас (памер ва ўсіх 46—48, рост 160—165) стала прыкідваць нейкія з рэчаў, пад музыку, у руху, дэманстраваць іх у спальні ды калідоры, вырашаць, што каму пасуе, хто што забірае і будзе насіць.

Такім чынам мы раздзяваліся, у нешта адзяваліся, круціліся перад люстэркам і ледзь не да слёз рагаталі, бо да Марыніных сукенак Любка дастала з шафы каўнер з чарнабуркі, да маіх цёмных доўгіх спадніц — мужаў капялюш. У ход пайшлі ўсе Любіны туфлі і басаножкі, сумачкі, шалікі, пацеркі, дзяжкі, стужкі... Прычым рэчы не проста падбіраліся, яны яшчэ і падганяліся: адна з нашых сябровак, Марына, трохі ўмела шыць, а таму адразу прымярала, дзе ўкараціць рукавы, дзе застрачыць (альбо наадварот — распусціць) вытачкі... Карацей, атрымалася цэлае прадстаўленне.

У выніку ў Любкі мы тады затрымаліся: па дамах сталі раз'язджацца позна, але ж шчаслівыя-шчаслівыя!

Назаўтра з раніцы я вырашыла на хвілінку заехаць да Любы, каб падзякаваць за абноўкі, якія з яе гардэробчыку «перабраліся» ў мой, і за проста цудоўны вечар!

— Мы даўно так не смяяліся! — сказала я сяброўцы.

— Было з чаго, — згадзілася яна, нешта яўна недагаворваючы і адводзячы вочы.

Мне трэба было ведаць, чаму?

Выпытваць давялося доўга, але ж я свайго дамаглася: Люба ўрэшце прызналася, што яе муж павінен быў прыехаць з камандзіроўкі на наступным тыдні ў аўторак, а прыехаў — на гэтым, і якраз у... пятніцу.

Чаму ён яе не папярэдзіў, чаму, прыехаўшы дамоў, не зайшоў у кухню, дзе мы так слаўна вячэралі, — Люба не ведала. Можа, трохі раўнаваў яе і хацеў паглядзець, што ж будзе далей, можа, вырашыў не перашкаджаць нам?

Факт, што падчас усіх нашых прымерак ён — нікім не заўважаны — быў... у спальні на балконе.

Чалавек ён, трэба сказаць, досыць інтэлігентны, не ў турме гадаваўся, а таму... Глядзеў ён на нашу мітусню ці не, я не ведаю. Можа, і не. Але асадак застаўся.

У Любы, відаць, таксама, бо яна больш ніколі не збірала нас на прымеркі. Тая была апошняя.

Вікторыя С.,

г. Мінск.

ЛЮБОЎ НЕ БЛІНЦЫ...

Вучні нашай школы падчас летняй фальклорнай экспедыцыі запісалі безліч мясцовых жартаў ды праўдзівых гісторый! Яны сведчаць аб працавітасці і кемлівасці тутэйшых людзей, іх уменні пасмяяцца з сябе і пасмяшыць (а то і павучыць!) іншых. Ну вось мяркуйце самі.

Неяк у вёску прыехала працаваць маладая настаўніца, да адзінокай жанчыны ўладкавалася на кватэру.

Не так важна, колькі там пражыла, але ж, мусіць, спадабалася гаспадыні, бо аднойчы тая сказала:

— Трэба табе хлопца добрага знайсці. Мала іх тут, але ж ёсць адзін на прыкмеце — высокі, прыгожы. Дзяўчат, праўда, перабірае... Ды ажэніцца — перастане... Таму ты не варонь: калі ён часам зойдзе, тут жа венік бяры і падмятай падлогу, прычым не да парога мяці, а наадварот...

Пачула гэта настаўніца і толькі пасмяялася.

А прыгажун між тым час ад часу ля іх дома праходзіў. Неяк гаспадыня заўважыла, што пад вокнамі ўжо, — у шыбу тук-тук-тук, а сама — за фіранку...

Праз дзень хлопец пытае ў дзяўчыны:

— Гэта ты мне знак падавала, калі я на аўтобус ішоў?

— Не, — адказала тая.

Дзяцюк, вядома ж, не паверыў: падумаў, што яна пасаромелася прызнацца. Значыць, сціплая... Стаў да яе больш прыглядацца, дадому падводзіць, а ў хату на вячоркі неяк зайшоў — гаспадыня тут жа за венік: па чыстай падлозе (прычым ад парога!) ім водзіць ды шэпча пад нос: «Замятаю яго ў хату, каб нікуды не пайшоў», «Замятаю яго ў хату...»

Дзеўка, як убачыла гэта, як пачула, аж зайшлася ад рогату! Яна ж думала, што жанчына пажартавала...

Праз паўгода маладыя пажаніліся. Добра жывуць, дваіх дзетак гадуюць.

Тамара Марцэвіч,

в. Ёдкі,
Лідскі раён.

АБЯЦАНКІ-ЦАЦАНКІ, А ДУРНЮ... КЛОПАТ

Гэту гісторыю я пачула ад сваёй сваячкі. Апавядаючы яе, Лідачка смяялася ледзь не да слёз. Хоць, як потым прызналася, у тыя «шалёныя 90-я», больш за 20 гадоў назад, ёй было зусім не да смеху.

Пачалося з таго, што ў вёсцы, і якраз каля іхняга дома (дарэчы, самага дыхтоўнага), спынілася досыць «крутая» іншамарка. З яе выйшаў мужчына, як кажуць, каўказскай нацыянальнасці, знайшоў у двары гаспадара (Лідачкі, як на тое ліха, дома не было) і стаў слёзна прасіць дапамагчы яму — выручыць з бяды. Маўляў, на дарозе, тут непадалёк, спыніла міліцыя, выпісала штраф, а заплаціць яго няма чым, ну хоць плач: грошы дома ляжаць... Дык ты ўжо, братка, зрабі мне ласку, пазыч 200 долараў. А я вінаваты не буду — аддзячу: сёння ж вечарам прывязу табе і грошы, і скрыню каньяку, і цэлы мех цукру, і грэчкі (усё гэта было дэфіцытам)...

Прымаўку пра абяцанкі-цацанкі вясковец Саўка, вядома ж, чуў, але і чалавеку, які так шчыра прасіў, хацелася верыць! Тым больш што каўказец, апроч абяцанняў, пакідаў неслабы заклад — дзесяць новых скураных куртак ды пакет з беласнежным цюлем.

...З вось такім, як уяўлялася Саўку, вельмі багатым здабыткам ён і сустрэў з работы сваю Лідусю. Ледзь не з парога пачаў хваліцца проста рэдкай удачай! Маўляў, танцуй, дарагая, мы з табой і дагэтуль нядрэнна жылі, а ўжо ж зараз... Гасцінцаў будзе поўная хата!

«Я дзе стаяла, — расказвала Ліда, — дык там і села. Кажу: «Сава, цябе развялі, як апошняга дурня! Дубіна ты, хамут стары! Вось папомні маё слова: ніхто да нас не прыедзе — ні з грашыма, ні з каньяком, ні без...»

Як у ваду глядзела: застаўся Саўка з носам, дакладней — са «стосам» танных чорна-карычневых куртак са скуразамяняльніку. Той чалавек, відаць, не змог прадаць іх паштучна і сумленна, а таму не прыдумаў нічога лепшага, як знайсці дурня, каб загнаць яму праз падман і «оптам».

«Саўка не з такіх быў, ён не ўзяў бы тавар, хоць бы таму, што долараў у вёсцы тады ў вочы ніхто не бачыў, — казала Ліда. — Мы іх купілі першыя, бо якраз напярэдадні на сямейнай радзе вырашылі пакрысе збіраць на «Жыгулі» — на Саўкаву даўнюю мару. 250 долараў займелі — 200 Саўка таму незнаёмцу аддаў».

...Ну вядома ж, шкада іх было, але што зробіш? Сужэнцы пагаравалі крыху ды паехалі ў райцэнтр на рынак, каб прыцаніцца да куртак, паглядзець, за колькі іх можна збыць. У сваёй вёсцы прадаваць не хацелі, бо людзі спыталі б, адкуль. Падманваць — не выпадала, праўду казаць — таксама...

Але ж тут здарылася ўдача: у госці да іх прыехаў Лідзін брат. А жонка ў яго — жанчына яшчэ тая: што хочаш купіць і што хочаш прадасць!

Вось яны і ўзяліся за гэтую справу: на машыне праехаліся па вёсках у суседнім раёне. Як тыя цыганы, пахадзілі па хатах... І бензіну спалілі, і паўдня патрацілі, і стаміліся, і трохі няёмка было, але ж восем куртак прадалі.

Саўку ў выніку засталіся дзве. Дзякуй богу, знасіў. А вось цюль той у верандзе на вокнах і дагэтуль вісіць. Як напамін пра тое, што бясплатны сыр бывае хіба што ў пастцы.

Таццяна Маркава,

г. Віцебск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

Эпідэмія дурасці

Розум уключыцца пасля...

СЯБРОЎКА з Германіі прыслала фота берлінскага магазіна тыпу нашай «Мілы». На паліцах, заўжды запоўненых мылам, антысептыкамі для рук, антыбактэрыяльнымі сурвэткамі, — амаль пуста, стаіць пару нейкіх бутэлечак. Там, дзе была рознага кшталту туалетная папера — тая ж карціна. Адным словам, наступствы каранавіруса. «Глядзі там, запасайся на ўсякі выпадак!» — жартам параіла мая Ірына. «Нічога, калі што якое — газет у запасе хапае», — гэтаксама жартам адказала я. Дарэчы, хадзіла ўчора ў тую ж «Мілу», дзяўчатам падарункі глядзець. Пастаяла ля поўнай паліцы з туалетнай паперай, падумала... А рука сама пацягнулася, хоць дома толькі пачатая ўпакоўка стаіць. «Стоп» я здолела сказаць сабе ў самы апошні момант (чым вельмі ганаруся). Бо да якой ступені дурасці трэба дайсці, каб туалетную паперу па некалькі пачак купляць.

2. Об итогах деятельности ОАО «Паритетбанк» за 2019 год, в том числе о реализации стратегического плана развития ОАО «Паритетбанк» на 2018–2020 годы.
3. Отчет о работе Наблюдательного Совета за 2019 год, о результатах самооценки эффективности деятельности Наблюдательного Совета, его членов, о результатах внутренней оценки эффективности деятельности Правления.
4. Отчет о работе независимых директоров в соответствии с пунктом 15 Положения о Наблюдательном Совете ОАО «Паритетбанк».
5. О заключении Ревизионной комиссии по результатам проведения ежегодной ревизии за 2019 год.
6. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2019 год.
7. О распределении прибыли и выплате дивидендов за 2019 год, об использовании нераспределенной прибыли прошлых лет.
8. Об избрании Наблюдательного Совета.
9. Об избрании Ревизионной комиссии.
10. О размере вознаграждений и компенсаций расходов независимым директорам.

Список лиц, имеющих право на участие в очередном годовом Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра акционеров, сформированного по состоянию на 12 марта 2020 года.

Лица, имеющие право на участие в очередном годовом Общем собрании акционеров, могут ознакомиться с информацией (документами):

о деятельности ОАО «Паритетбанк» за 2019 год согласно требованиям законодательства Республики Беларусь – начиная с 6 марта 2020 г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 9.00 до 13.00 и с 13.45 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Киселева, 61а, каб. 306, а также в ЦБУ, РКЦ, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк»;

по вопросам повестки дня – 25–26 марта 2020 г. с 9.00 до 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Киселева, 61а, каб. 306;

а также 27 марта 2020 г. по месту проведения очередного годового Общего собрания акционеров при прохождении регистрации.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в очередном годовом Общем собрании акционеров, будет проводиться 27 марта 2020 г. по месту проведения очередного годового Общего собрания акционеров с 10.20 до 10.50 при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Проезд к месту проведения очередного годового Общего собрания акционеров от автовокзала «Центральный» и станции метро «Каменная Горка» маршрутным такси «Минск – Ивенец».

Телефон для справок: +375 (17) 237 76 79.

Сайт: paritetbank.by
УНП 100233809
Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27 октября 2014 года № 5

Уважаемые акционеры

ОАО «Слуцкий льнозавод»

31 марта 2020 г. в 12.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Слуцкий льнозавод» по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 300

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год и основных направлениях деятельности Общества в 2020 году;
2. Отчет наблюдательного совета Общества о работе за 2019 год;
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссии финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год. Рассмотрение аудиторского заключения по годовой бухгалтерской отчетности за 2019 год;
4. Утверждение годовых отчетов, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках за 2019 год;
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2019 год, о выплате дивидендов за 2019 год, утверждение направлений использования чистой прибыли Общества на 2020 год и первом квартале 2021 года;
6. Избрание членов наблюдательного совета ОАО «Слуцкий льнозавод»;
7. Избрание членов ревизионной комиссии ОАО «Слуцкий льнозавод»;
8. Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Дата формирования реестра владельцев акций общества, на основании которого составляется список лиц, имеющих право на участие в собрании, – 25 марта 2020 года.

Время регистрации участников – в день проведения собрания с 11.30 до 11.45 по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 300.

Регистрация акционеров осуществляется по паспорту, а представителей акционеров – по паспорту и доверенности.

Телефон для справок: +375-1795-97518.

УНП 690657228

Песню бярыце з сабою...

Рубрыку вядзе Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com

Дарагія беларусачкі!
Са святам вас 8 Сакавіка!
Няхай ваша жыццё будзе як песня — прыгожае, шчаслівае, светлае.
Здароўя, дабрабыту і кахання.

МАЦІ, МАТУЛЯ, МАМА
Вершы — Валянціна ГІРУЦЬ-РУСАКЕВІЧ.
Музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.

Куплет 1:
Мне б да цябе спяшацца хуткакрыла,
Ды крылы тыя падразае час...
Спатоліцца б святлом усмешкі мілай
І прыхінуцца ціха да пляча.

Прыпеў:
Маці, матуля, мама —
Першае слова самае,
Цёплае і лагоднае,
Найдарагое, роднае.
Маці, матуля, мама,
Хай і цябе таксама
Дзеці цяплом атуляць —
Мамачку, маму, матулю.

Куплет 2:
Ў галінках бэзу пад акенцам вецер
Табе хай перашэптвае-пяе,
Матуля, мама, лепшая на свеце,
Ўсе словы найласкавыя мае.

Прыпеў.

Куплет 3:
Жыццё гады, як пацеркі, нанітвае,
І сёння з пакаяннем гавару:
За ўсе, што без спатканняў нашых, дні твае —
Даруй, матуля любая, даруй.

Прыпеў.



Не сезон

ПАЧНЕ ДЗЕЙНІЧАЦЬ ЗАБАРОНА НА ЛОЎЛЮ ШЧУПАКА

Гэта жаданая здабыча для рыбаловаў-аматараў, а яго лоўля — займальны занятак. Але ёсць перыяды, калі гэты від знаходзіцца пад асаблівай аховай.

Як нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, з 1 сакавіка ў большасці рэгіёнаў краіны (за выключэннем Віцебшчыны) ўведзена забарона на лоўлю шчупака, якая працягнецца да 15 красавіка (у Віцебскай вобласці яна будзе дзейнічаць з 9 сакавіка да 25 красавіка).

Ахоўныя меры звязаны з пачаткам нерасту ў дадзенага віду. Шчупак ідзе на яго раней за іншых веснавых нерастуючых рыб, паколькі не так патрабавальны да прагрэву вады, а часам нерастуе нават пад лёдам. Прэснаводны драпежнік вельмі важны для балансу іхціяфаўны, ён з'яўляецца свайго кшталту рэгулятарам: знішчае малакаштоўную дробязь, хворых і аслабленых рыб, што спрыяе лепшаму росту каштоўных відаў і аздараўленню іх папуляцый.

Вылаў шчупака падчас нераставай забароны цягне сур'ёзную адказнасць. За кожную незаконна здабытую асобіну спаганяецца шкода ў трайным памеры — па 9 базавых велічынь (243 рублі). Таксама парушальніку можа быць прызначаны штраф у памеры да 50 базавых велічынь, згодна з арт.15.35 КаАП РБ. Прычыненне шкоды на суму 100 і больш базавых велічынь цягне крымінальную адказнасць па арт. 281 КК РБ і яшчэ больш суровыя санкцыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Даты | Падзеі | Людзі

6 САКАВІКА

У краіне

1910 год — нарадзіўся Аляксандр Пятровіч Мазалёў, беларускі мастак, педагог. З 1939-га выкладаў у Віцебскім і Мінскім мастацкіх вучылішчах, з 1956-га — у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Працаваў у гістарычным, бытавым, батальным жанрах, а таксама пісаў партрэты і пейзажы.

1945 год — нарадзіўся Уладзімір Сцяпанавіч Муха, беларускі вучоны ў галіне інфарматыкі і аўтаматычнага кіравання, доктар тэхнічных навук (1994), прафесар (1996).

1980 год — нарадзіўся Аляксей Валер'евіч Жарнасек, беларускі спартсмен (вадналыжны спорт), майстар спорту Беларусі міжнароднага класа (1995), заслужаны майстар спорту Беларусі (2009). Пяціразовы чэмпіён свету (1998, 2000, 2002) за электрацягай. Чэмпіён Еўропы за катарам і за электрацягай (2000), сярэбраны (1996, 2000, 2001, 2002) і бронзавы (1996 — двухразовы, 1998) прызёр чэмпіянатаў Еўропы ў розных відах практыкаванняў.

1995 год — адбыўся афіцыйны візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ў штаб-кватэру Еўрапейскага Саюза (Брусель) і яго рабочы візіт у Каралеўства Бельгія. Падпісаны Пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь з Еўрапейскім Саюзам, міжурадавыя пагадненні паміж Рэспублікай Беларусь і Каралеўствам Бельгія аб пазбяганні падвойнага падаткаабкладання, аб аўтамабільных зносінах.

У свеце

1475 год — нарадзіўся Мікеланджэла Буанароці, італьянскі скульптар, жывапісец, архітэктар і паэт. Адзін з найбуйнейшых творцаў эпохі Адраджэння і ранняга барока. Яго творы лічыліся найвышэйшымі дасягненнямі мастацтва яшчэ пры жыцці самога майстра.

1815 год — нарадзіўся Пётр Паўлавіч Яршоў, рускі пісьменнік. Аўтар вершаванай казкі «Канёк-Гарбунок», лірычных вершаў, п'есы «Сувораў і станцыйны наглядчык».

1870 год — нарадзіўся Оскар Штраус, аўстрыйскі кампазітар. Аўтар аперэт «Вясёлыя нібелунгі», «Мроі пра вальс», «Адважны воін» і іншых.

1900 — нарадзіўся Георгій Фядотавіч Адзінцоў, военачальнік, маршал артылерыі, прафесар. Адыграў важную ролю ў арганізацыі абароны Ленінграда, артылерыйскага забеспячэння прарыву блакады ў час Вялікай Айчыннай вайны.

1925 год — у Маскве выйшаў першы нумар газеты «Пионерская правда».

2000 год — брытанскі рок-музыкант Эрык Клэптан уведзены ў Залу славы рок-н-рола. Прычым такім чынам ён быў адзначаны трэці раз! Упершыню Клэптан стаў членам Залы славы ў 1992-м як гітарыст гурта The Yardbirds, на наступны год увайшоў у яго як член трыа Cream, а гэтым разам заслужыў такое пачэснае права сваёй сольнай кар'ерай.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.46	18.57	11.11
Віцебск —	7.36	18.45	11.09
Магілёў —	7.36	18.47	11.11
Гомель —	7.31	18.45	11.14
Гродна —	8.00	19.13	11.13
Брэст —	7.59	19.15	11.16

Месяц

Першая квадра
2 сакавіка.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Астапа, Георгія, Данілы, Цімафея.*
К. *Клаўдзіі, Ружы, Эльвіры, Віктара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

А цяпер уявіце сабе савецкага школьніка, які ўвесь дзень сядзіць дома, утаропіўшыся ў тэлефон!

— Калі раніцай дзяўчына кажа, што хоча пазнаёміць мяне з бацькамі, я губляюся.

— Губляешся, што адказаць?

— Не, назаўжды.

Якімі дальнабачнымі былі вынаходнікі, якія прыдумалі на джынсах спераду маленькую кішэньку для запальніцы! У цяперашняга пакалення гэта кішэнька для флэшкі.

На сумоўі:

— У вас у рэзюмэ напісана, што ваша моцная рыса — таямнічасць. Жадаеце што-небудзь дадаць?

— Не.

Памяняў машыну на новую, паехаў на рынак, потым доўга шукаў, дзе я паставіў сваю старую машыну...

Сезонные скидки!
ТЕПЛИЦЫ
ЕВРО Пласт
Новинка 2020 года
Парники
Души
Беседки
ООО «ПТД ИМпласт»
УНП 691363105
Тел.: (29) 876-17-43 МТС, (29) 189-26-82 А1
БЕСПЛАТНАЯ ДОСТАВКА ПО РБ!!!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 940.
Нумар падпісаны ў 19.30 5 сакавіка 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

6 сакавіка 2020 г. № 9 (545)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

СУПРАЦОЎНІЦТВА

Атмасфера даверу спрыяе парламенцкаму дыялогу

Ёсць свая логіка і сімволіка ў тым, што напярэдадні Міжнароднага свята 8 Сакавіка ў Мінску сустрэліся дзве з самых уплывовых жанчын на постсавецкай прасторы – старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Качанава і старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Валянціна Мацвіенка

Фота БелТА.

Беларусь наведвае парламенцкая дэлегацыя Савета Федэрацыі Расіі на чале з яго старшынёй Валянцінай Мацвіенка. Двухдзённы афіцыйны візіт расійскіх сенатараў пачаўся з цырымоніі ўскладання вянка да стэлы «Мінск — горад-герой» на праспекце Пераможцаў.

Вядомы расійскі палітычны дзеяч і дыпламат Валянціна Мацвіенка неаднойчы наведвала нашу краіну, у тым ліку і ў якасці губернатара Санкт-Пецярбурга, кожны раз абавязкова сустракалася з палітычным кіраўніцтвам Беларусі. Вось і цяпер дзелавая частка яе візіту пачалася перамовамі са старшынёй Савета Рэспублікі Беларусі Наталляй Качанавай. Спачатку ў вузкім, а затым ў пашыраным фармаце.

Што абмяркоўвалі? Па словах Наталлі Качанавай, вельмі сімвалічна, што візіт дэлегацыі праходзіць у юбілейны год Вялікай Перамогі, бо памяць аб подзвігу народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны свяшчэнная і высакародная. Падчас размовы акцэнт быў зроблены на далейшым развіцці ўзаемавыгадных двухбаковых сувязяў у сферах эканомікі, навукі, культуры, адукацыі.

Валянціна Мацвіенка падзякавала калегам з Савета Рэспублікі за запрашэнне, традыцыйную беларускую гасціннасць, магчымасць весці парламенцкі дыялог. Яна пагадзілася з думкай Наталлі Качанавай аб важнасці развіваць рабочыя стасункі – у розных фарматах.

Спікер верхняй палаты расійскага парламента таксама адзначыла, што сувязі Расіі і Беларусі – гэта асаблівыя сувязі. Захаваць усё тое, што звязвае абедзве краіны, абодва народы – задача сучасных палітыкаў. Яна звярнула ўвагу, што паміж прэзідэнтамі Расіі і Беларусі склаліся добрыя адносіны. Яны часта сустракаюцца, абмяркоўваюць актуальныя пытанні.

стар. 2

СТАЛІЧНЫ ЧАС

У Мінскім гарсавеце – новы старшыня

З сакавіка на 14-й пазачарговай сесіі Мінскага гарадскога Савета яго дэпутаты аднагалосна абралі Андрэя БУГРОВА новым старшынёй.

minsknews.by

Калегі палічылі, што яго дэпутацкая дзейнасць у Лошыцкай выбарчай акрузе № 9, папярэдняя плённая работа ў Савеце на пасадзе старшыні камісіі па галоснасці, самакіраванні і правапарадку дае падставы разлічваць на паспяховыя вынікі Андрэя Бугрова ўжо ў якасці кіраўніка гарсавета. Нагадаем, яго папярэднік – Васіль Панасюк – быў абраны ў Палату прадстаўнікоў сёмага склікання.

Што вядома пра Андрэя Бугрова? Нарадзіўся ў Мінску ў сям'і вайскоўца, 44 гады. Мае дзве вышэйшыя адукацыі – юрыдычную і эканамічную. Спачатку атрымаў дыплом Інстытута сучасных ведаў, а затым Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. У свой час працаваў на розных пасадах у Беларусбанку і шэрагу сталічных кампаній. У 2007 годзе перайшоў у адкрытае акцыянернае таварыства «Цэнтрэнергамантаж». Гэта, нагадаем, адна з найбуйнейшых у Беларусі спецыялізаваных арганізацый у энергетычным будаўніцтве. Там працаваў і непасрэдна перад выбраннем старшынёй гарсавета: быў намеснікам генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце – кіраўніком аддзела па рабоце з персаналам. Так што пастаянна падтрымліваў кантакт з людзьмі.

Журналісты звярнулі ўвагу на лейтматыў выступлення Андрэя Бугрова адразу пасля выбрання: новы старшыня параіў дэпутатам любіць свой горад і разумець яго жыхароў, рабіць іх жыццё камфортным і прыстасаваным для рэалізацыі амбіцый, здольнасцяў і талентаў.

Што датычыцца канкрэтных захадаў, то Андрэй Бугроў, напрыклад, мяркуе разам з калегамі больш актыўна засяродзіцца на праблемах, звязаных з кіраваннем камунальнай уласнасцю сталіцы, уцягненнем у гаспадарчы абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца. Зразумела, у планах і вырашэнне сацыяльных пытанняў мінчан, дапамога сталым, інвалідам, нямоглым і адначасова больш шчыльная работа з моладдзю.

Леанід ТУГАРЫН.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Напярэдадні свята

Актуальнае інтэрв'ю: Наталля Качанава аб гендарнай роўнасці ў Беларусі. стар. 3

Крэатыўныя энтузіясткі

У Шумілінскім раёне Віцебшчыны жывуць ініцыятыўныя, нераўнадушныя актывісткі. Хто яны? стар. 4

Маляваць агнём



Адзіная ў краіне галерэя піяграфіі адкрылася ў Жодзіне. стар. 4

Каб слова засталося...

Аб клопатах жанчыны-кіраўніка «МС» расказала намеснік старшыні Брэсцкага аблсавета дэпутатаў Валянціна Пух. стар. 13

Пацікавіліся вопытам

Як у Нясвіжскім раёне Міншчыны вырашаюць праблему старых і трухлявых дамоў. стар. 16

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

Уважліва і кампетэнтна

Беларуская парламенцкая дэлегацыя ўзяла ўдзел у назіранні за парламенцкімі выбарамі ў Таджыкістане.

У яе склад увайшлі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Аляксандр Бабаловіч, якія працавалі ў складзе Місіі назіральнікаў ад СНД. Беларускія парламентарыі правялі маніторынг выбарчага працэсу ў дзень выбараў: наведвалі выбарчыя ўчасткі, гутарылі са старшынямі і членамі ўчастковых выбарчых камісій, кандыдатамі ў дэпутаты, мясцовымі назіральнікамі, сачылі за працэсам галасавання.

Падчас наведвання Душанбе Сяргей Рачкоў сустрэўся таксама са старшынёй Выканаўчага камітэта Садружнасці Незалежных Дзяржаў Сяргеем Лебедзевым. На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні правядзення маніторынгу выбарчых кампаній па лініі СНД, а таксама ўзаемадзеяння на пляцоўцы Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД.

Што датычыцца шляхоў па далейшым умацаванні міжпарламенцкага ўзаемадзеяння Беларусі і Таджыкістана, размова на гэтую тэму адбылася з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Таджыкістан Алегам Івановым.

Бюджэт сталіцы

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец узяла ўдзел у пасяджэнні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.

Падчас яго былі падведзены вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця сталіцы за мінулы год і акрэслены задачы на 2020-ы. Удзельнікі пасяджэння таксама азнаёміліся з выкананнем ключавых паказчыкаў эфектыўнасці работы гарвыканкама і заданняў па капітальным рамонце жыллёвага фонду, выкананнем бюджэту і іншымі пытаннямі.

Выступоўцы адзначалі, што ў выніку прынятых Мінскім гарвыканкамам захадаў па павышэнні эфектыўнасці функцыянавання эканомікі горада забяспечаны рост рэальнай заработнай платы, тэмп росту экспарту тавараў і паслуг перавысіў тэмп росту імпарту, выканана заданне па працаўладкаванні грамадзян на створаныя рабочыя месцы на новых прадпрыемствах і вытворчасцях (такім чынам за год было працаўладкавана амаль 28 тысяч чалавек), даходная частка бюджэту выканана на 100,1 працэнта.

Па выніках пасяджэння дадзены даручэнні на 2020 год па будаўніцтве і ўводзе жылля, капітальным рамонце жыллёвага фонду, павышэнні якасных паказчыкаў развіцця, паляпшэнні фінансавага стану арганізацый, скарачэнні колькасці нерэнтабельных і стратных прадпрыемстваў, выкананні дысцыпліны разлікаў, недапушчэнні росту пратэрмінаванай крэдыторскай і дэбіторскай запазычанасцяў, пратэрмінаванай запазычанасці па крэдытах і пазыках і гэтак далей.

Экспарт і інвестыцыі

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец узяў удзел у пасяджэнні Уздзенскага раённага выканаўчага камітэта, падчас якога разгледжаны вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця і выканання раённага бюджэту за 2019 год, а таксама задачы па выкананні бюджэту на 2020 год.

Парламентарый адзначыў недастатковую работу з боку выканкама па прыцягненні прамых замежных інвестыцый у эканоміку раёна, у тым ліку з выкарыстаннем афіцыйных інфармацыйных рэсурсаў. Ён таксама звярнуў увагу на няпоўнае асвятленне на афіцыйным сайце выканкама інфармацыі аб наяўных інвестыцыйных прапановах і адзначыў прысутнасць неактуальнай інфармацыі.

Акрамя таго, ім былі ўнесены ініцыятывы па ўдасканаленні работы структурных падраздзяленняў выканкама ў частцы нарошчвання экспартнага патэнцыялу і павышэння інвестыцыйнай прывабнасці раёна.

Атмасфера даверу спрыяе парламенцкаму дыялогу

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Адным з ключавых пунктаў праграмы візіту парламенцкай дэлегацыі стаў удзел высокіх гасцей у першым сумесным пасяджэнні арганізацыйных камітэтаў па падрыхтоўцы і правядзенні VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Ён, як вядома, адбудзецца восенню ў Мінску і Мінскай вобласці. У параўнанні з папярэднімі падобнымі форумамі рэгіёнаў, насычанымі пераважна гаспадарчымі па тэматыцы мерапрыемствамі, гэта сустрэча ў Беларусі будзе ў значнай ступені прысвечана гістарычнай спадчыне Вялікай Перамогі, як аснове развіцця сацыяльна-эканамічных і духоўных сувязяў народаў Беларусі і Расіі.

Гэтыя сувязі з кожным годам мацнеюць. Відаць, невыпадкова ў ходзе пасяджэння арганізацыйных камітэтаў Наталля Качанава адзначыла, што форум стаў добрай традыцыяй, важнай пляцоўкай для абмеркавання шырокага кола пытанняў беларуска-расійскага супрацоўніцтва, новых ідэй і ініцыятыў. Кожны год форум прырастае сумеснымі праектамі, новымі кантактамі рэгіёнаў, іх маладзёжных арганізацый, умацоўваюцца гуманітарныя сувязі.

Валянціна Мацвіенка падкрэсліла, што такія мерапрыемствы дазваляюць выбудоўваць доўгатэрміновыя эканамічныя сувязі паміж рэгіёнамі. Яна прывяла такія лічбы: за шэсць гадоў падчас форумаў было падпісана больш за 300 дзелавых пагадненняў прыкладна на два мільярды долараў. Аб палітычнай значнасці такіх фарматаў супрацоўніцтва можна меркаваць і па такім факце, што ў іх рабоце рэгулярна ўдзельнічаюць прэзідэнты абедзвюх краін.

У Мінску Валянціна Мацвіенка ўдзельнічала ў міжнароднай акцыі памяці «У гонар агульнай Перамогі!» у цырымоніі перадачы зямлі ў капсуле з месцаў пахавання савецкіх салдат пад Ржэвам Храму-помніку ў гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню нашай Айчыны.

У час знаходжання ў Савеце Рэспублікі Беларусі Валянціна Мацвіенка пакінула запіс у Кнізе ганаровых гасцей. У ёй кіраўнік парламенцкай дэлегацыі Савета Федэрацыі Расіі, у прыватнасці, выказала цёплыя і сардэчныя словы аб Беларусі.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Фота БелТА.

ДЗЕЛЯ РАЗВІЦЦЯ І ДЗЕЛЯ ПАМЯЦІ

Супрацоўніцтва беларускіх і расійскіх парламентарыяў сёлета праходзіць пад знакам агульнай Перамогі

Пра гэта заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА на сустрэчы са старшынёй Савета Федэрацыі Расійскай Федэрацыі Валянцінай МАЦВІЕНКА.

«Мы ў цэлым у Беларусі, і парламентарыі, вельмі высока цэнім ваш уклад у развіццё беларуска-расійскіх адносін. Значную ролю ў нашым будаўніцтве Саюзнай дзяржавы іграе Форум рэгіёнаў, які мы праводзім, і адным з ініцыятараў якога вы былі, — вітаў спікера верхняй палаты расійскага парламента старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Трэба сказаць, што людзі вельмі станоўча да гэтага адносяцца. Зрэшты гэта робіцца ў імя павышэння іх дабрабыту і камфорту жыцця. Думаем, што форум, які адбудзецца ў кастрычніку ў Мінску і Мінскай вобласці, таксама пройдзе паспяхова».

Уладзімір Андрэйчанка спыніўся яшчэ на адной важнай тэме беларуска-расійскага ўзаемадзеяння — святкаванні 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

«Мы разам кавалі гэту Перамогу, усе народы Савецкага Саюза, — сказаў спікер ніжняй палаты беларускага парламента. — Прэзідэнты нашых дзяржаў удзяляюць вельмі сур'ёзную ўвагу пытанням правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў з нагоды Дня Перамогі, якія былі зацверджаны яшчэ ў 2018 годзе на саміце кіраўнікоў дзяржаў СНД. Хачу праінфармаваць, што ў нас ужо распачатае выкананне гэтых мерапрыемстваў. У лютым у Брэсце, у мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой» быў дадзены старт эстафеце Памяці, якая ахопіць дзевяць дзяржаў СНД, у якой актыўны ўдзел возьмуць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, моладзь і грамадскія арганізацыі. Мы лічым, што гэта вельмі важна».

Уладзімір Андрэйчанка назваў Вялікую Айчынную вайну самым жудасным злачынствам у гісторыі чалавецтва: яе ахвярамі сталі 60 мільёнаў чалавек, з якіх 27 мільёнаў — жыхары Савецкага Саюза. У Беларусі загінуў кожны трэці.

«Мы, вядома, павінны не дапусціць, каб гэта трагедыя паўтарылася. Таму трэба зрабіць усё, каб захаваць гістарычную памяць пра вайну, абараніць яе, бо сёння вельмі шмат гарачых галоў, якія хочуць перапісаць гісторыю, — дадаў Уладзімір Андрэйчанка. — Усё гэта робіцца, каб дагадзіць нейкім інтарэсам, асабістым амбіцыям. Таму мы ў Палаце прадстаўнікоў прынялі рашэнне правесці 9 красавіка парламенцкія слуханні, прысвечаныя Вялікай Перамозе».

Уладзімір Андрэйчанка таксама закрануў пытанні ўзаемадзеяння з расійскімі калегамі на міжнародных пляцоўках. У прыватнасці, заверыў, што на 142-й Асамблеі Міжпарламенцкага Саюза Беларусь падтрымае ініцыяваную Расіяй Дэкларацыю аб парламенцкай дыпламатыі.

«Нас радуе, што вельмі добрыя адносіны наладжаны з Расійскай дэпутацыяй у Парламенцкай Асамблеі АБСЕ, — прадоўжыў спікер беларускага парламента. — Спадзяёмся і на працяг узаемадзеяння ў Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы».

Валянціна Мацвіенка падзякавала беларускаму боку за праграму, якая ўключае таксама наведванне Брэста, магчымасць аддаць доўг памяці тым, хто, абараняючы агульную тады краіну, прыняў першы ўдар фашысцкай Германіі на сябе.

«Вы правы, гэты год асаблівы, накладае адбітак на ўсю нашу дзейнасць, год агульнай перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Сапраўды, вельмі важна захаваць памяць, быць сумленнымі ў адносінах да гісторыі, — сказала яна. — Інакш гэта можа паўтарыцца. Калі не зразумець небяспеку новых выклікаў, не прымаць меры, то потым усе разам сутыкнёмся з вельмі сур'ёзнымі наступствамі».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

АКТУАЛЬНОЕ ИНТЕРВЬЮ

Наталья КОЧАНОВА:

«ГЕНДЕРНОЕ РАВЕНСТВО — ОДИН ИЗ ПРИОРИТЕТОВ УСТОЙЧИВОГО РАЗВИТИЯ БЕЛАРУСИ»

Международный женский день — особая дата для каждой женщины. В канун праздника «МС» попросило председателя Совета Республики Наталью Кочанову поделиться мнением о роли женщин в современном обществе, рассказать о личном опыте совмещения работы и семейной жизни, а также оценить перспективы совершенствования гендерной политики в Беларуси.

— Наталья Ивановна, Вы — яркий пример успешной женщины, авторитетного политика. Какие качества помогли Вам добиться успеха?

— Я никогда не была карьеристкой, не думала о том, чтобы занять высокие должности. На каждом этапе своей профессиональной деятельности стремилась получить конкретный результат. Важно, чтобы то, что ты делаешь, приносило пользу — стране, людям. Это для меня главное. Не всегда все получается так, как хочешь. Но любая проблема — это своего рода проверка прочности, закалка и, безусловно, жизненный опыт, который помогает принимать решения порой в непростых ситуациях.

Мне повезло, что у меня крепкий тыл — моя семья. Родные всегда с пониманием относились к тому, что много времени провожу на работе. Но на личное тоже находится время: когда есть возможность, собираемся семейным кругом, обсуждаем последние новости.

— Вы согласны с тем, что сегодня у женщин больше возможностей стать успешными наравне с мужчинами — в карьере, бизнесе?

— Безусловно, роль женщины в общественной, экономической и политической жизни общества существенно изменилась. Современные женщины более амбициозны, инициативны, они стремятся быть независимыми, самодостаточными и востребованными. Это во многом обеспечивает им успех. Растет их присутствие в бизнес-среде: доля женского предпринимательства в Беларуси составляет около 32 %. Значительно расширяется влияние женщин на уровне принятия решений. Сегодня у нас почти 46 % руководителей — женщины. Высокий процент женщин и в органах судебной власти — 69 %. Растет их число в составе Парламента: если доля женщин в первом созыве составляла всего 14 %, то сейчас — около 35 %.

Эти позитивные тенденции являются результатом поэтапного совершенствования гендерной политики. Государство всегда уделяло этому особое внимание. Гендерное равенство определено одним из приоритетов в Национальной стратегии устойчивого социально-экономического развития до 2030 года.

При этом меры по поддержке женщин, защите их прав носят комплексный характер. Это устранение барьеров при приеме их на работу, продвижении по службе, в оплате труда, а также создание дополнительных возможностей для развития своего дела, специальные программы по переобучению и так далее. С другой стороны, многое делается для поддержки материнства, сохранения репродуктивного здоровья женщин, противодействия домашнему насилию. То есть создаются условия для того, чтобы женщины могли максимально самореализоваться как в профессии, так и в семейной жизни. Эффективность этой работы высоко оценивают и международные эксперты: в глобальном рейтинге гендерного равенства Беларусь лидирует на постсоветском пространстве, занимая 29-ю позицию из 153 стран.

> Роль женщины в общественной, экономической и политической жизни общества существенно изменилась. Современные женщины более амбициозны, инициативны, они стремятся быть независимыми, самодостаточными и востребованными. Это во многом обеспечивает им успех.

Однако это не значит, что все проблемы решены. Многое еще предстоит сделать, прежде всего, в части сокращения разрыва в заработной плате мужчин и женщин. Есть резервы для дальнейшего развития женского предпринимательства и самозанятости.

Необходимо учитывать, что женщины больше работают и имеют меньше свободного времени: после работы их ожидают домашние дела. Подсчитано, что у работающих женщин в нашей стране на ведение домашнего хозяйства и уход за детьми уходит 26 часов 29 минут в неделю, у работающих мужчин — 14 часов 14 минут. Разница, как видите, существенная.

— Некоторые эксперты утверждают, что гендерное равенство может привести к дальнейшему снижению рождаемости.

— Их главный аргумент в том, что сегодня женщины предпочитают создавать семью в более позднем возрасте. Если в 2011 году в Беларуси средний возраст женщины при вступлении в первый брак составлял 24,5 года, то в 2019 году — уже 26,1 года. Брачный возраст поступательно повышается. И это общемировая тенденция. Так, средний возраст невест, впервые вступивших в брак, увеличился по сравнению с 1990 годом в Чехии (на 6,5 года), Словакии (на 6), Венгрии (на 6,6), Эстонии (на 5,4), Швеции (на 5,3 года). В соседней с нами России возраст регистрации первого брака у женщин также вырос — с 22,2 до 25 лет.

На это есть причины: происходит более позднее социальное взросление женщин. Сначала они учатся, ищут работу, стремятся построить карьеру, решить жилищные вопросы и только после этого вступить в брак. Рождение ребенка также откладывается. Кроме того, многие семейные пары живут сегодня по принципу «чайлдфри», то есть осознанно без детей. Лично я это не поддерживаю. Институт семьи — важнейшая ценность. Так воспитывали меня. Так я воспитывала своих детей.

Дети наполняют жизнь смыслом, объединяют семью. Родители совместно преодолевают многие трудности, это укрепляет отношения.

— Наталья Ивановна, есть ли сегодня необходимость в разработке отдельного закона, направленного на обеспечение гендерного равенства?

— На сегодняшний день в этом нет необходимости. Нашим законодательством в достаточной степени урегулированы различные аспекты данного вопроса. Важно, чтобы реализуемые меры по защите прав женщин в экономике и социальной сфере были максимально эффективными, нацеленными на решение конкретных задач и проблем, с которыми сталкиваются женщины.

Ольга АНУФРИЕВА.

ПОВЕСТКА-2030

Потенциал евразийской интеграции

На прошлой неделе в Совете Республики состоялась встреча вице-спикера верхней палаты парламента, Национального координатора по достижению Целей устойчивого развития Анатолия Исаченко с председателем Коллегии Евразийской экономической комиссии Михаилом Мясниковичем.

Участники встречи обсудили вопросы подготовки регионального Форума Евразийского экономического союза по устойчивому развитию, проведение которого запланировано на 9—10 апреля в Минске. По данным организаторов, в нем примут участие представители министерств и ведомств стран ЕАЭС, международных организаций, ученые, эксперты, руководители предприятий, бизнес-сообществ и другие заинтересованные. Во время проведения пленарной сессии Форума на тему «Цели устойчивого развития как фактор региональной интеграции» ожидается участие премьер-министров государств — членов ЕАЭС.

Программа Форума насыщенная и предусматривает обсуждение потенциала евразийской интеграции и возможностей использования передового международного опыта в реализации Повестки дня в области устойчивого развития на период до 2030 года. Также состоится обмен успешными практиками в сфере разработки, анализа и мониторинга мер по достижению ЦУР, оценки их эффективности.

Тематические сессии организуются по нескольким направлениям:

— включение Целей устойчивого развития в национальные и региональные повестки развития;

— методологические и статистические аспекты мониторинга достижения ЦУР;

— Цели устойчивого развития и ведение бизнеса; роль инноваций и цифровизации в достижении Целей.

На пути к достижению Целей

Вице-спикер Совета Республики, Национальный координатор по достижению Целей устойчивого развития Анатолий Исаченко принял участие в круглом столе по вопросам достижения ЦУР, который прошел в начале недели в Министерстве иностранных дел.

В тематическом круглом столе также приняли участие министр иностранных дел Владимир Макей, Постоянный координатор ООН в Беларуси Иоанна Казана-Вишневецкий и руководители представительств Программы развития ООН, Детского фонда ООН и Фонда ООН в области народонаселения в Беларуси.

Анатолий Исаченко в своем выступлении акцентировал внимание на том, что выстроенная в нашей стране система управления процессом достижения ЦУР доказала свою функциональность на практике. При этом важность ее преломления на региональный уровень имеет особое значение. «Необходимо сделать больший акцент на работу в регионах, выстроить систему оценки, чтобы определить, что уже сделано и в каком направлении необходимо двигаться дальше», — подчеркнул Национальный координатор.

Министр иностранных дел поздравил Анатолия Исаченко с назначением на должность Национального координатора по достижению Целей устойчивого развития и заверил в готовности МИД оказывать необходимое содействие.

Во время дискуссии участники также обсудили перспективы совместной деятельности национальных и зарубежных партнеров в контексте выполнения Повестки дня в области устойчивого развития на период до 2030 года. Обсуждались и вопросы координации национальных усилий, международного сотрудничества, разработки совместных с ООН программных документов по тематике устойчивого развития.

КРЭАТЫЎНЫЯ ЭНТУЗІЯСТКІ ШУМІЛІНШЧЫНЫ

Напярэдадні міжнароднага жаночага свята карэспандэнт «МС» пабываў у Шумілінскім раёне, што на Віцебшчыне, каб расказаць аб ініцыятыўных і нераўнадушных жанчынах, якія на розных пасадах выконваюць службовыя абавязкі не толькі дзеля зарплаты, справаздачы, стажу і падобных рэчаў — у іх, як кажуць, «вочы гараць», шмат ідэй, планаў, пастаянна нешта прыдумваюць, каб людзям вакол было цікавей, утульней, і самі ж рэалізуюць ідэі, вывучаюць попыт тутэйшых, шукаюць крыніцы фінансавання...

Да старэйшыны... па рыбу!

У Башнеўскай вясковай бібліятэцы Шумілінскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы працуе **Ала САФОНЧЫК.** У гэтай невялічкай бібліятэцы каля трохсот чытачоў, што параўнальна шмат.

Напэўна, іншая і выдавала б спакойна кнігі. Ну, напэўна, праводзіла б вечары ў гонар паэтаў і пісьменнікаў. Але такое — не пра гэтую жанчыну. Падчас размовы яна вельмі эмацыянальна знаёміла з установай культуры і расказвала, што сюды прыходзяць не толькі па кнігі. Многіх цягне абмеркаваць навіны, проста пагаварыць ці параіцца.

Цікава, што да таго, як стаць бібліятэкарам, суразмоўніца працавала каля 15 гадоў у мясцовай гаспадарцы — галоўным ветэрынарным урачом. А ў «храме кніг» — каля 17 гадоў. Бібліятэкар з'яўляецца старэйшынай населенага пункта. Канешне, вяскоўцы заўсёды адно ў аднаго як на далоні, а старэйшына ведае, як той казаў, усё і пра ўсіх яшчэ больш. І стараецца, каб вясковыя людзі маглі цікава правесці вольны час. Напрыклад, народу падабаюцца вечары-

ны, якія вельмі нагадваюць тэлеперадачу савецкага часу «Ад усёй душы». У прыватнасці, яе героем стаў вядомы мясцовы жыхар Леанід Пагарэльскі.

— Ён доўгі час кіраваў сельскагаспадарчай арганізацыяй. І некалькі пакаленняў вяскоўцаў удзячныя яму за тое, што вельмі клапаціўся аб падначаленых, многім без перабольшвання даў пуцёўку ў жыццё. Бывала, і перавыхоўваў тых, хто гэтага заслугоўваў. Яму ўжо 77 гадоў. Але вельмі жвавы, лёгкі на пад'ём, ахвотна дзеліцца вопытам з цяперашнімі аграрыямі. Пасля вечарыны, прысвечанай яму, падняўся з крэсла клуба і... расплакаўся сціплымі мужчынскімі слязамі. Сказаў, што такое паважлівае стаўленне за тое, што ён зрабіў для землякоў, шчырыя словы ўдзячнасці, пажаданні дабрыні дадуць яму яшчэ больш сіл, — згадвае суразмоўніца.

Вясковая дзятва вельмі паважае старэйшыну за тое, што яна з імі «на адной хвалі» не толькі ў бібліятэцы. Ала Валянцінаўна арганізуе паходы з краязнаўчым ухілам. А яшчэ хлопчыкі і дзяўчынкі з задавальненнем дапамагаюць вырашаць «рыбныя пытанні». Побач з бібліятэкай — возера. З вокнаў вадаём, да якога некалькі дзясяткаў метраў, добра відаць.

Муж бібліятэкаркі — заядлы рыбак. Для школьнікаў арганізоўваюць святы юшкі, на якіх тыя вучацца кухарыць, а затым яны і сваякоў вучаць.

І «вежавая» пляцоўка

У Башнеўскай базавай школе матэматыку выкладае вясковая энтузіястка **Марына АЛЯКСЕЕНКА.** Працуе тут ужо амаль 35 гадоў і ніколі не хацела змяніць месца жыхарства.

Марына Рыгораўна родам з Пастаўшчыны, а ў Шумілінскі раён пераехала, калі выйшла замуж. Жанчына ніколі не застаецца раўнадушнай і хоча, каб словы пра павышэнне якасці жыцця і работы былі не проста прыгожым лозунгам. Яна не раз даказвала, што пры жаданні, настойлівасці можна насамрэч горы звярнуць. І недахоп грошай — вечная праблема, але пры жаданні іх знайсці не так ужо і складана.

Напрыклад, жанчына стала ініцыятарам таго, каб на новым узроўні ў сельскай школе былі арганізаваны заняткі фізкультурай і спортам. У выніку ўсё атрымалася. Вяскоўцы выйгралі конкурс сацыяльных праектаў і змаглі купіць абсталяванне для спартыўнай залы школы. Рыэлтарская кампанія перавяла 1600 рублёў, для таго каб школьнікам набылі лыжы і спартыўнае адзенне, палаткі для паходаў...

Вясковая жыхарка таксама была адным з аўтарам ідэі арганізаваць пляцоўку для адпачынку землякоў. Ініцыятыва «Вежы LIVE» атрымала падтрымку і добры грамадскі рэзананс.

Разам са старшынёй сельскага Савета дэпутатаў Аляксандрам Дзмітрэнкам, старэйшынай аграгарадка Алай Сафончык і іншымі ініцыятыўнымі людзьмі на беразе возера Будавесць добраўпарадкавалі зону адпачынку. Правялі там жа «Фестываль вады».

— Вяскоўцы розных узростаў наводзілі парадак, актыўна бралі ўдзел у стварэнні і ўстаноўцы так званых малых архітэктурных формаў, паказе творчых нумароў і г. д. І цяпер культурны адпачынак на свежым паветры вельмі папулярны сярод тутэйшых, — згадвае яна.

Настаўніца таксама распрацоўвае веласіпедныя экскурсіі. Натхняе школьнікаў і іх бацькоў займацца творчасцю, упрыгожваць не толькі ўстанову адукацыі, але і родны край. Між іншым, яна — намеснік старшыні праўлення грамадскай арганізацыі «Экабум». Сярод іншага сочыць з вучнямі за станам вады ў прыватных калодзежах, вывучае рэкі і азёры...

Летапісец сельсавета

А **старшыня Мішнявіцкага сельскага Савета дэпутатаў, аднаго з васьмі ў раёне, Галіна ЗЯЗЮЛЬКА,** з адукацыі выкладчык біялогіі, у вольны час займаецца выпускам інфармацыйнага бюлетэня «Рэха падзей».

Дзякуючы ёй штогод выходзіць некалькі нумароў выдання тыражом каля трыццаці экземпляраў — летапіс сельсавета.

Кіраўнік улады пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню ў той жа час каля шасці гадоў з'яўляецца рэдактарам. У нумарах — не толькі навіны: ёсць шмат цікавай інфармацыі пра мінулае. Напрыклад, пра тое, што ў 1864-м у Мішнявічах адкрылі царкоўнапрыходскую школу на сорак навучэнцаў. У ёй было ўсяго тры класы. У 1910-м адкрылі яшчэ 4-ы і 5-ы. У вёсцы Барсучына таксама была школа з чатырма класамі.

— У 1922 годзе на тэрыторыі сельсавета было ўжо сем школ першай ступені і адна — другой ступені. Таксама былі адкрыты бібліятэка і хата-чытальня, — расказвае Галіна Уладзіміраўна.

А ў 1924 годзе тут былі арганізаваны калгасы «Прагрэс» і «Трактар». У 1930-м яны аб'ядналіся ў адну камуну, якая існавала да 1934-га.

Дэпутат таксама піша гумарэскі і расказы. З вялікім інтарэсам яна арганізуе розныя культурныя мерапрыемствы для выбаршчыкаў. Упершыню ў раёне арганізавалі свята 100-гадовага юбілею сельсавета. Каб у сцэнарыі мерапрыемства не прапусціць важных падзей з багатай гісторыі, яна шмат часу працавала ў архівах.

Актывістка лічыць, што ў адміністрацыйнай адзінкі вялікі турыстычны патэнцыял. У заказніку больш за сорак відаў птушак; не заходзячы далёка ў лес, можна ўбачыць мядзведзя, рысь. Балоты заказніка вядомыя далёка за межамі Беларусі. Шумілінскі раён мае добрую славу і дзякуючы валунам: тут знаходзіцца самы вялікі ў краіне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара і з асабістага архіва гераінь публікацыі.

ШТО ПАГЛЯДЗЕЦЬ

МАЛЯВАЦЬ АГНЁМ

Адзіная ў краіне галерэя піраграфіі адкрылася ў Жодзіне

«Экаарт», маляванне агнём, альбо, прасцей кажучы, выпальванне па дрэве: у Жодзінскай карціннай галерэі ў лютым пачала працаваць новая выставачная зала — піраграфіі. На сёння яна першая і адзіная ў Беларусі.

У экспазіцыю ўвайшлі 16 работ, а таксама прылады, якімі карыстаўся пры іх стварэнні майстар піраграфіі Ігар Каперскі. Трэнер па самба і дзюдо СДЮШАР Ігар Уладзіміравіч больш за 35 гадоў аддаў свайму творчаму захапленню і фактычна зрабіў яго другой прафесіяй. У асабістай калекцыі мастака помнікі архітэктуры і прыгожыя краявіды роднай зямлі, партрэты вядомых людзей, біблейскія сюжэты — звыш 70 работ. Астатнія, а іх больш за сотню, знаходзяцца ў музеях і прыватных калекцыях у Беларусі і за мяжой. Як адзначыў **першы намеснік старшыні Жодзінскага райвыканкама Сяргей КОНАН,** такое прызнанне беларускага майстра сведчыць пра запатрабаванасць гэтага кірунку мастацтва: «Ігар — чалавек, які практыкуе піраграфію і можа вучыць ёй іншых. Яго работы маюць вялікую мастацкую каштоўнасць, і для нашай пляцоўкі вялікі гонар размяшчаць іх».

Як плануецца, галерэя будзе перыядычна абнаўляцца. Ужо ў сакавіку на змену гарадскім пейзажам прыйдуць партрэты вядомых асоб — спартсменаў і трэнераў, грамадскіх і палітычных дзеячаў, людзей мастацтва, а ў перспектыве, паводле слоў дырэктара Жодзінскага краязнаўчага музея Дзмітрыя Мініча, запрашаць да ўдзелу ў выстаўцы будуць мастакоў-піраграфаў з розных краін.



Вікторыя ЗАХАРАВА.

Тэлесеткі

ДЛЯ ЖАНЧЫНЫ З ДУШОЙ

Белтэлерадыёкампанія рыхтуе для сваіх глядачак букет з любімых кінастужак, тэматычных і віншавальных праграм і канцэртаў. Таксама тэлеканалы медыяхолдынга ў дзень 8 Сакавіка ўпрыгожаць спецыяльныя лагатыпы і міжпраграмныя віншавальныя відэа.

На «Беларусь 1» рыхтуюць атмасферны выпуск праграмы «Усе за стол» у 10.20. У гэты дзень гасцямі студыі стануць удзельнікі вакальнага арт-гурта «Беларусы». «У святочным выпуску мы падабралі лёгкае меню, але не абышлі ўвагай стравы з морапрадуктаў. А госці, у сваю чаргу, падзеляцца ўласнымі рэцэптамі таго, як арыгінальна павіншаваць сваіх каханых. Для нашай аўдыторыі музыканты таксама падрыхтавалі сюрпрыз! Увогуле выпуск атрымаўся добры і вясёлы, з атмасферай утульнасці — і ўсім гэтым мы з задавальненнем падзелімся з гледачамі», — абяцае вядучая праекта Алена Дуброўская.

А вось на канале «Беларусь 2» віншаваць жанчын пачалі загадзя. Напярэдадні свята здымачная група праекта «Уключайся!» змяніла лакацыю: па вясеннюю атмасферу стваральнікі праграмы адправіліся ў трапічныя аранжарэі і алеі батанічнага сада. Вядучыя «Уключайся!» абяцаюць прыкласці максімум намаганняў, каб мілыя дамы атрымалі зарад пазітыўнай энергіі на ўвесь уік-энд.

Таксама тут падрыхтавалі серыю пяшчотных і чуллівых відэаролікаў, якія стануць падарункам для ўсіх жанчын, бо героі кожнага з іх — рэальныя людзі са сваімі шчырымі пачуццямі і гісторыямі кахання. Непасрэдна на выхадных нас чакаюць вядомыя і любімыя фільмы: «Аліса ў краіне цудаў», «Прыгажуня» і іншыя.

Алена ДРАПКО.
Фота дадзена Белтэлерадыёкампаніяй.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 89

Аўтар сённяшняй задачы — Б. Маслаў ***(гл. дыяграму).***

Белыя: Крс8, Сd8, Cf1, Ka3, nb4 (5).

Чорныя: Крa7, пс6 (2).

Мат за 3 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, Мінск, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Мінску прайшлі чэмпіянаты Беларусі сярод шахматыстаў да 18 гадоў. Сярод юнакоў (33 удзельнікі, у тым ліку чатыры майстры ФІДЭ) перамог Арцём Стрыбук, другое і трэцяе месцы занялі адпаведна Арцём Сіняўскі і Максім Царук (усе трое — майстры ФІДЭ).

Глеб Галкін — Арцём Стрыбук. 1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. Kc3 d5 4. cd K:d5 5. Cd2 K:c3 6. C:c3 Cg7 7. e4 0-0 8. Kf3 Cg4 9. Ce2 Kc6 10. d5 C:c3+ 11. bc C:f3 12. C:f3 Ke5 13. Ce2 c6 14. f4 Kd7 15. dc bc 16. e5 Kc5 17. Фc2 Фa5 18. 0-0 Ka4 19. Лfc1 Лab8 20. Cf3 Лb2 21. Фd3 Лd8 22. Фe3 Лdd2 23. C:c6 Kb6 24. c4 Лe2 25. Фf3 Фc5+ 26. Kph1 Лf2, 0:1.

Сярод дзяўчат (20 удзельніц) перамагла Ксенія Зелянцова, якая здолела апярэдзіць адзінага майстра ФІДЭ, чэмпіёнку Беларусі сярод жанчын Аляксандру Тарасенка, хоць і саступіла ёй ў асабістай сустрэчы. Тарасенка ў выніку другая, а трэцяе месца заняла Варвара Палякова, якая, дарэчы, абыграла ў асабістай партыі Аляксандру.

Варвара Палякова — Аляксандра Тарасенка. 1. e4 c5 2. Kf3 g6 3. d4 cd 4. K:d4 Cg7 5. Kc3 Kc6 6. K:c6 bc 7. Cc4 Kf6 8. Ce3 0-0 9. 0-0 Фa5 10. Фd2 Лd8 11. Cb3 e6 12. Лad1 Фh5 13. f3 d5 14. ed cd 15. Ke2 Ca6 16. Лfe1 Фe5 17. Kd4 Фd6 18. Фa5 Лab8 19. Cf2 e5 20. Ke2 Лb5 21. Фd2 d4 22. Kg3 Cb7 23. c3 Ke8 24. Ke4 C:e4 25. Л:e4 Kpf8 26. cd f5 27. Лe2 ed 28. Фd3 Лc5 29. Ch4 Лdc8 30. Ce7+ Ф:e7 31. Л:e7 Кр:e7 32. Фa6 Kd6 33. Ф:a7+ Л8c7 34. Лe1+ Kpf6 35. Фa4 Крg5 36. Фb4 Ce5 37. Фd2+ Cf4 38. h4+, 1:0.

* * *

У мінулым выпуску мы расказалі пра вынікі першай лігі чэмпіянатаў Беларусі і прывялі адну з партый пераможцы мужчынскага турніра. А вось як гуляла Ксенія Зелянцова, якая перамагла ў жаночым спаборніцтве.

Ксенія Зелянцова — Ксенія Норман. 1. e4 c5 2. Kf3 d6 3. Cb5+ Kc6 4. 0-0 Cd7 5. c3 Kf6 6. Лe1 g6 7. d4 cd 8. cd Cg7 9. Kc3 0-0 10. h3 Ke8 11. Cf4 Kc7 12. Cf1 e5 13. Ce3 b6 14. Фd2 f5 15. de de 16. Cg5 Фc8 17. Лad1 Ce6 18. ef C:f5 19. Ch6 Лd8 20. Фe3 Л:d1 21. Л:d1 Фe8 22. Kb5 K:b5 23. C:b5 e4 24. C:g7 ef 25. Ф:f3 Ce4 26. Фc3 Лc8 27. Cc4+, 1:0.

* * *

Мікіта Маёраў заняў першае месца на турніры ў Францыі (64 удзельнікі), а Мікалай Аляўдзін падзяліў 1-2-е месцы на турніры ў Польшчы.

* * *

Пяцёра беларускіх рашальнікаў узялі ўдзел у XVI Міжнародным інтэрнэт-турніры, які адначасова праводзіўся ў 43 гарадах 32 краін. Удзельнікі рашалі аднолькавыя заданні, а іх вынікі былі звезены арганізатарамі ў агульную табліцу. Віктар Зайцаў падзяліў 33—36-е месцы з 202, Аляксандр Булаўка заняў 37-е месца.

Аляксандр Булаўка быў шосты ў двух турнірах у Маскве — XIV Кубку часопіса «Уральскі праблеміст» і Кубку Расійскага дзяржаўнага сацыяльнага ўніверсітэта (Мемарыяле А. Пачынка).

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Ce6! Першыя правільна адказалі Уладзімір Ізотаў, Ігар Ананіч, Васіль Жуковіч, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук. Задачу з пазамінулага выпуску правільна рашыў таксама Ігар Ананіч.

Вадзім ЖЫЛКО.

Настройка

Вясне — вітанне, жанчыне — віншаванне!

Увесну разам з прыродай пачынаюць квітнець і людзі. Адбываецца гэта 8 Сакавіка, калі адзначаецца Міжнародны дзень жанчын. Усмешкі, віншаванні і прызнанні ў каханні, кампліменты і словы ўдзячнасці — вось што чуюць на свой адрас дзяўчаты, матулі, бабулі ад блізкіх людзей у такі дзень. Аднак бывае і так, што свята застае жанчын на рабоце. Напярэдадні важнай даты «Звязда» пацікавілася ў вядучых беларускіх тэлеканалаў, каму выпадала праводзіць святочны дзень у эфіры, што яны думаюць пра такое супадзенне.

Вольга МАКЕЙ, палітычны аглядальнік, вядучая праграмы «Галоўны эфір» на «Беларусь 1», намеснік дырэктара АТН:

— Мы, тэлевізійнікі, даўно прызвычаіліся працаваць, калі ўся краіна адпачывае! Часта менавіта мы і ствараем свята для ўсіх, хто ў такія дні знаходзіцца дома са сваімі блізкімі і ўключае тэлевізар. А калі работа ў цябе любімая, то ў святочны дзень быць там — двайное задавальненне. Сёлета 8 Сакавіка выпадае на нядзелю, я буду весці вынікоўую праграму «Галоўны эфір» разам са сваім мужам Сяргеем Гусачэнкам. Так супала, што мы разам працавалі ў эфіры і 23 лютага, калі ўсе святкавалі Дзень абаронцаў Айчыны, таму ніхто ў нас не пакрыўдзіўся. *(Смяецца.)* Зноў разам павіншуем усю краіну!

І ўвогуле, 8 Сакавіка — цудоўнае свята вясны. Таму ў гэты дзень абавязкова ўдзяліце ўвагу сваім родным і блізкім жанчынам: патэлефануйце маме, бабулі, сяброўкам. А яшчэ лепш — зрабіце сюрпрыз. Бо святы для таго і існуюць, каб мы дарылі адно аднаму радасць!

Кацярына КРУТАЛЕВІЧ, вядучая навін тэлеканала АНТ:

— Так, наша грамадская арганізацыя ніколі не мінае падобных падзей у горадзе. Матулям вялікіх сямействаў мы дарылі, напрыклад, швейныя машынкі. У апошнім выпадку самым маладым па стажы работы бацькам, паводле папярэдняй дамоўленасці, падарылі вялікі чайны сервіз. Усе гэтыя дамы не забываем падчас акцыі «Нашы дзеці», прыходзім пад Новы год, у Дзень абароны дзяцей, стараемся трымаць у полі зроку такія сем'і пастаянна. Наогул наша арганізацыя даволі актыўная, многія раённыя арганізацыі працуюць цікава, творча, ажыццяўляюць нямала сваіх праектаў. Літаральна гэтымі днямі завяршаецца падрыхтоўка абласнога этапу конкурсу «Жанчына года». Напярэдадні свята ў новым тэатры лялек мы правядзём урачыстае мерапрыемства з уручэннем дыпломаў і сувеніраў пераможцам абласнога конкурсу ў пяці намінацыях. Летась прайшлі справаздачы і выбары на ўзроўні раённых арганізацый. Нашы пярвічкі і раённыя аб'яднанні зверылі свае пазіцыі. Можна адзначыць, што цікава працуюць жанчыны ў Брэсце, у Пінску, у Кобрыне ды іншых раёнах. Галоўнае, на мой погляд, што актывісты арганізацыі стараюцца ахапіць сваёй увагай дзіцячыя дамы і прытулкі, бальніцы і дамы састарэлых — тых, хто мае найбольшую патрэбу ў падтрымцы.

> Варта было б вызначыць для спадчыннікаў часовы адрэзак, напрыклад, у пяць гадоў, за які яны маглі б афарміць дом, уступіць у правы і пачаць падтрымліваць хоць мінімальны парадак. Пасля заканчэння вызначанага тэрміну пры адсутнасці цікавасці з боку сваякоў былых гаспадароў мясцовая ўлада атрымала б большую свабоду дзеянняў.

— Напярэдадні свята што б вы сказалі як дырэктар абласной пошты ўсім выбаршчыкам, сябрам жаночай ды іншых грамадскіх арганізацый?

— Скажу, каб не забывалі адно аднаго віншаваць, гаварыць добрыя словы. Прыемна, што вяртаецца традыцыя ручнога пісьма. Нядаўна, пасля рамонту ў аддзяленні сувязі па праспекце Машэрава, 32 мы адкрылі куток ручнога пісьма, куды можна прыйсці і напісаць нейкія словы сябрам, знаёмым, блізкім. Мы рады, што ён запатрабаваны. Цяпер пошта прапануе такі выбар паштовак! Занатоўвайце думкі, пажаданні, абавязкова стаўце дату, каб і праз дзясяткі гадоў засталося напісанае вамі слова. Усе нашы электронныя віншаванні, прывітанні, думкі знікнуць, згубяцца на прасторах інтэрнэту, а напісанае рукой застанецца. Мы ўпэўніліся ў гэтым, калі адкрылі музей паштовай сувязі. Людзі прыходзяць туды, цікавяцца гісторыяй. А паштоўка — гэта і ёсць гісторыя, толькі ўжо наша асабістая.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский мясокомбинат № 1» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже права заключения договора аренды:

	Лот № 1
Наименование объекта	**Изолированное помещение бытового обслуживания населения с инв. № 610/D-68953 в здании общежития с гостиницей (инв. № 610/С-16090)**
Местонахождение объекта	Минская область, г. Борисов, ул. Максима Горького, д. 107-1
Общая площадь, кв. м	90,00
Срок договора аренды	3 года
Начальная цена права заключения договора аренды, бел. руб.	380,25
Сумма задатка, бел. руб.	38,03
Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду Объекта	456 белорусских рублей 30 копеек (с понижающим коэффициентом 0,4) при использовании помещения для оказания услуг парикмахерских, прачечных, по ремонту и пошиву обуви, фотоуслуг, по ремонту и пошиву швейных меховых кожаных головных изделий, по ремонту и пошиву и вязанию трикотажных изделий, услуг по ремонту кожгалантереи и зонтов, услуг по ремонту и техническому обслуживанию бытовой радиоэлектронной аппаратуры бытовых машин и приборов; 1140 белорусских рублей 75 копеек (без понижающего коэффициента)
Целевое использование имущества	Для осуществления деятельности по оказанию бытовых услуг населению

Базовая арендная величина с 01.04.2019 составляет 16,90 бел. руб. В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта, перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBAN BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Аукцион состоится **07.04.2020** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.04.2020** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17, сайт в сети интернет: www.rlt.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ТОРГАХ (В ВИДЕ АУКЦИОНА)

Лепельский районный исполнительный комитет Витебской области объявляет открытые торги в форме аукциона о предоставлении права на заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака (Astacus leptodactylus) на территории следующих водных объектов:

Наименование водоема	Допустимый объем изъятия рака	Начальная цена продажи предмета аукциона*, млн рублей	Сумма задатка, млн рублей
Озеро Матырино	200 кг	540 р.	270 р.

ОРГАНИЗАТОР – Лепельский районный исполнительный комитет, 211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, контактный телефон (802132) 41275, факс 48074, электронный адрес: **tat.chues@yandex.by.**

ПРОДАВЕЦ – Лепельский районный исполнительный комитет 211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, контактный телефон (802132) 41275, факс 48074.

1. Аукцион состоится 7 апреля 2020 года в 15.00 по адресу: 211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, кабинет 220.

2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица или индивидуальные предприниматели Республики Беларусь.

Участникам необходимо на адрес организатора предоставить:

- заявление на участие в аукционе;
- копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий счет организатора аукциона, заверенную банком;
- юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;
- индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
- представителям юридических лиц или индивидуальных предпринимателей предоставить доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

3. Документы, необходимые для участия в аукционе, принимаются организатором аукциона по адресу: **211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, кабинет 220 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**

4. **Последний день приема документов – 3 апреля 2020 года до 13.00.**

Заключительная регистрация участников – 7 апреля 2020 года с 12.00 до 14.30.

К участию не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

5. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет BY68AKBB36043190010252100000 в ЦБУ № 211 филиала № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC FRBBBY21216, УНП 300039625, ОКПО 040626632000, получатель платежа – Лепельский районный исполнительный комитет. Участнику, выигравшему торги, сумма внесенного задатка учитывается в счет возмещения затрат на организацию и проведение торгов, изготовление документации, необходимой для их проведения.

6. Организатор аукциона после опубликования извещения о проведении аукциона вправе снять предмет с аукциона до его проведения в случаях отсутствия участников аукциона либо наличия только одного участника аукциона. При этом комиссия составляет протокол о снятии с аукциона предмета аукциона и признания аукциона несостоявшимся.

7. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене.

8. Если ни один из участников аукциона не желает приобрести предмет аукциона по первой названной аукционистом цене, аукционист называет эту цену трижды и снимает данный предмет аукциона с аукциона, о чем комиссией составляется протокол.

9. Аукцион проводится в соответствии с Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 699.

10. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Согласие либо отказ такого лица приобрести предмет аукциона отражается в протоколе аукциона. Лицу, выразившему согласие приобрести предмет аукциона, сумма внесенного задатка засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.

11. Победитель аукциона (лицо, предложившее наиболее высокую цену) в течение 5 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий счет сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка.

12. Решение комиссии по результатам торгов оформляется протоколом. Протокол подписывается председателем, членами комиссии и победителем торгов в день проведения торгов.

УЧАСТКОВЫ Ў СПАДНІЦЫ

Капітан міліцыі Вольга ШАГАВА пра любоў да прафесіі, асаблівасці дзіцячай псіхікі і жаночыя сакрэты

Неверагодна, але гэта факт. Вольга чацвёрты год запар становіцца ў Магілёўскай вобласці найлепшай у сваёй міліцэйскай прафесіі. А летась нават прадэманстравала другі вынік па краіне, саступіўшы канкурэнту з Віцебска ўсяго адзін бал. Любоў да прафесіі ў жанчыны, лічы, з дзяцінства, яна мэтанакіравана ішла ў яе і цяпер не ўяўляе сябе кімсьці іншым. Пры гэтым Вольга знаходзіць час для падтрымання сваёй ад прыроды прыгожай знешнасці, гатавання смачных страў для сваіх мужа і дачкі і нават вырошчвання агуркоў на ўласнай градцы. Адным словам, застаецца сапраўднай жанчынай.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Выросла на дзіцячых дэтэктывах

Некаторыя да пенсіі не могуць вызначыцца з прафесіяй, а Вольга ўжо ў школе ведала, што будзе міліцыянерам – і кропка. Ні бацькі, ні яе родныя ніякіх адносін да міліцыі не мелі. Пісьменніца Дар'я Данцова і экранная Каменская, якія натхнілі на суровую міліцэйскую рамантыку, здаецца, не адну дзяўчыну, на выбар прафесіі ў гэтым выпадку таксама не паўплывалі. Проста дзяўчынка літаральна расла на дзіцячых дэтэктывах, якіх, як яна згадвае, у іх сельскай бібліятэцы было шмат.

Упартасці ў дасягненні запаветнай мэты стаць міліцыянерам у Вольгі было ажно занадта. Калі яна з першай спробы не паступіла ў акадэмію МУС, дык, вядома, засмуцілася. Але ўспрыняла няўдачу як іспыт. Каб не траціць дарэмна год, падала дакументы ў каледж мастацтваў у Магілёве і стала вучыцца на актрысу. А налета забрала свае дакументы і зноў пайшла на штурм міліцэйскай ВНУ. Не пашчасціла ёй і гэтым разам – самае крыўднае, што не хапіла ўсяго аднаго бала. І тады дзяўчына зрабіла па-іншаму: вырашыла, што будучаму міліцыянеру не перашкодзіць веданне роднай мовы і літаратуры, і паступіла ў Магілёве ў МДУ імя А. Куляшова на філолага, а з трэцяга курса тут жа паралельна стала вучыцца на юрыста. Універсітэт скончыла, лічы, з двума дыпломамі. І адразу ж накіравалася ў Краснапольскі РАУС – як той казаў, дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся. Дзяўчыну прынялі і на паўгода адправілі ў Мінск, каб яна прайшла так званы курс маладога байца – атрымала спецыялізацыю. І ўжо ў маі 2014 года малады спецыяліст пачала працаваць супрацоўнікам інспекцыі па справах непаўналетніх. А ў 2015 годзе стала пераможцам штогадовага абласнога конкурсу-агляду на званне найлепшага ўчастковага інспектара па справах непаўналетніх. З таго часу яна пастаянная ўдзельніца спаборніцтваў на званне найлепшага па прафесіі. Каб перамагчы ў такім сур'ёзным конкурсе, павінна быць моцная тэарэтычная і практычная база. Удзельнікі праходзяць іспыты на веданне нарматыўных дакументаў, па стральбе, медыцынскай падрыхтоўцы, на валоданне баявымі прыёмамі барацьбы і нават па красамоўстве. Са стральбой, медпадрыхтоўкай і баявымі мастацтвамі ў Вольгі падчас апошніх рэспубліканскіх спаборніцтваў было ўсё добра. Вось толькі двойчы памылілася, адказваючы на трыццаць пытанняў па заканадаўчай базе.

Усе гэтыя навыкі патрэбны міліцыянеру не толькі падчас іспытаў, але і ў паўсядзённым жыцці. Праўда, пакуль рабіць штучнае дыханне або затрымліваць злачынцу з дапамогай зброі не выпадала. Хоць рызыкаваць даводзілася, і сур'ёзна. Вольга тады служыла ў міліцыі першы год. Вечарам яна павінна была прысутнічаць на дыскатэцы ў вёсцы, сачыць там за парадкам. На месца дзеяння яна прыйшла адна, кіроўца застаўся ў машыне. Нечакана да дзяўчыны ў міліцэйскай форме падышоў незнаёмы малады чалавек і пачаў яе абражаць, груба хапаць за рукі. Вольга паспела выклікаць дапамогу з РАУС, але трэба было дачакацца, пакуль тая даедзе ад Краснаполля. Між тым сітуацыя абвастралася, да крыўдзіцеля далучыліся яго таварышы. На шчасце, ні зброю, ні баявыя прыёмы выкарыстоўваць не давялося, дапамога падаспела своечасова. Як потым высветлілася, Вольга прыцягнула да адказнасці непаўналетняга брата незнаёмца за распіццё спіртных напояў, і старэйшы брат вырашыў такім чынам адпомсціць.

Якія тайны ў сабе хавае «сіні кіт»

На ўліку інспекцыі па справах непаўналетніх Краснапольскага раёна 600 дзяцей, 10 з якіх на кантролі.

– Самы цяжкі ўзрост – гэта 12-13 гадоў: падлеткі імкнуцца неяк самазацвердзіцца, звярнуць на сябе ўвагу, – кажа Вольга. – Аднойчы кампанія падлеткаў правярала на трываласць вокны, кідаючы ў іх цагліны. Або быў выпадак з адным хлопцам, які нагледзеў у двары «Жыгулі», што не зачыняліся, прыйшоў увечары, сеў за руль і паехаў катацца. Яшчэ і сяброў з сабой паклікаў. Скончылася тым, што машына трапіла ў ДТЗ – на шчасце, ніхто не пацярпеў. Але гэта не пазбавіла вінаватых ад пакарання.

Вольга прызнаецца, што ў сваёй рабоце кіруецца жаночай інтуіцыяй і веданнем азоў псіхалогіі, якія атрымала падчас вучобы на філолага. Аднойчы яна высвятляла ў 15-гадовага падлетка, хто яго пабіў. Хлопец спачатку проста яе ігнараваў. І тады яна... наліла гарбаты, дастала цукеркі і прапанавала скласці ёй кампанію. Падлетак сапраўды аказаўся галодны і быў вельмі ўдзячны за пачастунак. Непрыкметна высветлілася, што ён выпіваў разам са сваім дзядзькам, пасварыўся і той пабіў яго.

А яшчэ быў выпадак, калі Вольга выратавала дзяўчынку ад суіцыду.

– Я атрымала з псіханеўралагічнага дыспансера паведамленне на 12-гадовую дзяўчынку з нашага раёна, у якой былі заўважаны на руках сляды парэзаў, – расказвае яна. – Я пагутарыла з маці, праманіторыла сацсеткі і высветліла, што дзяўчынка гуляе ў страшную гульню «Сіні кіт». Гэта дэструктыўная забава, якая развівае ў дзяцей суіцыдальныя нахільнасці. Міліцыя пастаянна маніторыць сусветнае павуцінне на прадмет такіх гульняў. На жаль, выпадкі ўсё ж такі здараюцца.

Лапуся Міхайлаўна

Вясна – для любой жанчыны свята, і Вольга асабліва любіць гэтую пару года. Птушкі пяюць, паветра напаўняецца неверагодным пахам свежасці, настрой узнімаецца. І хоць сваю міліцэйскую форму маладая жанчына носіць з задавальненнем, з'яўляецца жаданне адзецца ў якую-небудзь модную сукенку. «Я заўважыла, што калі я не ў форме, мяне нават знаёмыя не пазнаюць», – смяецца Вольга. Тым больш што ад высокіх абцасаў на рабоце адразу ж давялося адмовіцца. Хадзіць трэба столькі, што сапраўды цяжка вытрымаць. Але прычоска, макіяж, пазногці заўсёды павінны быць у парадку. Гэта таксама зброя. Бо, калі ты хочаш быць для непаўналетніх прыкладам, павінен сам ва ўсім прытрымлівацца дысцыпліны. Суразмоўніца згадвае, што для адной сваёй непаўналетняй стала нават аўтарытэтам. Дзяўчынка была вельмі складаная, але паступова выправілася. Цяпер яна ўжо дарослая, але па звычцы ў складаных пытаннях звяртаецца да Вольгі. І называе яе пяшчотна – Лапуся Міхайлаўна. І такіх удзячных, як яна, хапае. Так што «Найлепшы ўчастковы па справах непаўналетніх» Вольга не толькі па прафесійных якасцях, але і ў звычайным жыцці. У Краснапольскім РАУС, дзе яна працуе, з 54 чалавек асабовага складу – толькі чатыры жанчыны. На 8 Сакавіка начальнік РАУС Андрэй Казінец абавязкова агучвае ўрачыстую прамову і супрацоўніцы атрымліваюць у падарунак кветкі і сувеніры. Усё ж такі не кожнай жанчыне шчасціць апынуцца ў цэнтры ўвагі адначасова столькіх мужчын.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Анжаліка ГОМАН, старшыня Краснапольскага райсавета дэпутатаў:

– Раённы і сельскія Саветы дэпутатаў актыўна ўзаемадзейнічаюць з аддзелам унутраных спраў райвыканкама ў розных кірунках. Гэта перш за ўсё дзейнасць, накіраваная на прафілактыку правапарушэнняў і злачынстваў на тэрыторыі раёна. Супрацоўнікі міліцыі з'яўляюцца ўдзельнікамі сацыяльна-інфармацыйнага цягніка «Клопат», задзейнічаны ў рабоце Савета грамадскага пункта аховы правапарадку, назіральных камісій, дапамагаюць у рэалізацыі Указа Прэзідэнта № 357 «Аб пустуючых і старых дамах». У раёне існуе дакладна выбудаваная сістэма прафілактыкі правапарушэнняў і злачынстваў сярод непаўналетніх. Гэта вельмі важная і складаная работа, якая патрабуе высокага прафесіяналізму і адданасці. І Вольга Шагава – якраз той чалавек, які валодае гэтымі якасцямі.

ДАРОГІ, ДРЭВЫ, БАДЗЯЖНЫЯ САБАКІ

Да традыцыйных для прыёмаў на вёсцы праблем дадаліся нечаканыя пытанні і прапановы

— *Раман Сяргеевіч Талкуноў,* — прадстаўляецца белабрысы хлапчук са школьным заплечнікам.
Яму чатырнаццаць, і ён, так бы мовіць, пасол добрай волі:
— Мы вось з пацанамі прыйшлі даведацца, калі зможам купацца ў нашай мясцовай рэчцы Крупка? Улетку вельмі хочацца плаваць, а пляжу няма, забаронена.
З актуальнай праблемай на сустрэчу ў Дзень дэпутата прыйшлі ў тым ліку і школьнікі аграгарадка Крупец, што ў Добрушскім раёне.

— Пахвальна і вельмі прыемна, што хлопцы бачаць у нас саюзнікаў, а не высокіх гасцей, якім нельга даверыць сваё, набалелае, — адзначае **член Савета Рэспублікі Таццяна АБЕЛЬ.**

У зоне яе адказнасці — праблемы насельніцтва Гомельскага, Веткаўскага і Добрушскага раёнаў. Пытанне школьнікаў адразу перададзена на рэагаванне начальніку Добрушскага раённага падраздзялення МНС, дэпутату раённага і абласнога Саветаў дэпутатаў — Уладзіміру Маліноўскаму:

— Месца, прызначанага для купання, на жаль, няма, хоць рака невялікая і неглыбокая. У суседніх населеных пунктах ёсць абсталяваныя пляжы, тут не будзе. Вердыкт — купацца нельга.

Дэпутат і член Савета Рэспублікі раюцца і разам вырашаюць, што можна скласці спіс ахвотных плаваць у басейне.

— Між тым магчыма вазіць дзяцей у басейн у суседнюю Ветку, — адзначае Уладзімір Маліноўскі. — Школа і сельсавет дапамогуць.

Чарада парламенцёраў сыходзіць, падлеткі задаволена ўсміхаюцца. Наступны раз, магчыма, прыйдуць са сваімі прапановамі ўжо на паперы.

Аператыўна знаходзяцца агульныя рашэнні і для больш складанага пытання — дарожнага. Пенсіянер Анатоль Кротаў расказвае, што дарога па вуліцы Сялянскай у аварыйным стане. Рэшткі былой асфальтавай раскошы — першасны пласт закаталі яшчэ ў канцы 80-х. Тое, што засталося, наогул нельга назваць дарожным пакрыццём.

— 250-300 метраў дарогі той, але па гэтай вуліцы ездзяць машыны на ток для збожжа, — перажывае мужчына.

У зале не перапыняюць: чалавек усё жыццё быў у кіраўніцтве мясцовай гаспадаркі і праблему ўзнімае не для сябе асабіста, а для ўсёй вёскі.

— Іншага напрамку няма, — працягвае Анатоль Кротаў. — Малакавозы ходзяць, возяць збожжа, дровы ў кацельню... Гэты першасны пласт асфальту не вытрымлівае. Зіма была такая, вільгаць, ужо пачалі па абочыне ездзіць, а там газаправод. Гэта вельмі сур'ёзна. Дапамажыце.

На зварот мясцовага жыхара рэакцыя імгненная. На сустрэчу з насельніцтвам Крупца прыехаў і **намеснік начальніка РАУС Добрушскага райвыканкама Мікалай МАСТАВЕНКА.** Ён тлумачыць, што існуе магчымасць у хуткім часе вырашыць пытанне. Абяцае ўзяць яго на кантроль:

— ДАІ выдасць прадпісанне, каб арганізацыя, на балансе якой знаходзіцца тэрыторыя, а гэта Добрушскае ДРБУ-150, вырашыла праблему. Гэта спецыялізаваная арганізацыя, якая мае і рэсурсы, і неабходную тэхніку, і кваліфікаваных спецыялістаў. Спачатку трэба, каб выехалі на месца і паглядзелі: які менавіта рамонт неабходна правесці, якімі матэрыяламі.

Людзі ўдзячныя, што іх праблему пачулі і дапамогуць вырашыць. Таму мясцовыя жыхары больш актыўна ўключаюцца ў дыялог з дэпутатамі. Пенсіянер Ягор Сідараў кажа, што мае працоўны стаж больш за 35 гадоў, але калі афармлялі пенсію, не ўключылі звесткі пра работу да пачатку 90-х гадоў. Пытаецца: ці магчыма нешта змяніць?

Сацработнік — Галіна Алампіева — просіць не за сябе, а, як кажа, «за сваіх старых». Яна агучвае праблему аварыйнага стану вадаправоднай калонкі на адной з вуліц: вада б'е з-пад зямлі, усё вакол залівае, рамантавалі не раз, але пакуль толку мала.

Старэйшына вёскі — Паліна Сазонава — звяртаецца з просьбай абрэзаць вялізныя асіны на вясковых могілках. Потым адважваецца і просіць сенатара на самым высокім узроўні ўзняць праблему недастатковага фінансавання сельскіх Саветаў.

Член Савета Рэспублікі Таццяна АБЕЛЬ і дэпутат абласнога Савета дэпутатаў, начальнік Добрушскага раённага падраздзялення МНС Уладзімір МАЛІНОЎСКІ гутараць з мясцовай жыхаркай.

Культарганізатар мясцовага Дома культуры Таццяна Долічава задае балючае пытанне: што рабіць з бадзяжнымі сабакамі, якія жывуць каля фермаў. Жывёлы не даюць вечарам прайсці па вуліцы.

Таццяна Абель і Уладзімір Маліноўскі прапануюць адзін з варыянтаў вырашэння: афармліць заяўку ў спецпрадпрыемства Добруша, якое выязджае ў раён для адлову безнаглядных жывёл. Але адзначаюць: гэта праблема не ўзнікае без прычыны. Некаторыя людзі выкідваюць жывёл на вуліцу. У Крупцы, дарэчы, дзясяткі дачных падворкаў. Пасля летняга сезона, калі гаспадары ад'язджаюць, і з'яўляюцца на вуліцах бадзяжкі. А вось пенсіянерка Наталля Кавалёва лічыць, што галоўная праблема — гэта пустуючыя будынкі:

— Памяшканняў шмат у нас, усе ў добрым стане, стаяць пустыя. Пры гэтым моладзь магла б тут, на месцы, адкрываць пункты бытавых паслуг для насельніцтва. У нас жа, каб прычоску зрабіць ці абутак адрамантаваць, трэба ехаць у горад, а нашы цырульнікі туды таксама едуць на работу.

На яе думку, калі б прапаноўвалі карыстацца памяшканнямі без арэндная платы, гэта вырашыла б праблему адтоку спецыялістаў у Добруш і Гомель.

Усе мясцовыя жыхары, якія выказалі ідэі або заявілі аб праблемах, атрымаюць пісьмовыя адказы на свае звароты. Між тым мы звяртаемся да **старшыні сельсавета Вольгі ДАВЫДОЎСКАЙ:** як яна ацэньвае вынікі сустрэчы? Увогуле, чым жыве Крупец, можа, аб чым мясцовыя і не дагаворваюць?

— Я на гэтай пасадзе толькі паўгода, — пачынае Вольга Васілеўна. — Аграгарадок Крупец — гэта і ёсць увесь наш сельсавет, усё вельмі кампактна. Тут больш за 1300 жыхароў. На сустрэчу з дэпутатамі прыйшлі прадстаўнікі ўсіх нашых працоўных калектываў: школы-садка, ФАПа, клуба, бібліятэкі і КСУП «Крупец». Тут вельмі добрыя транспартныя зносіны — да райцэнтра сем кіламетраў, да Гомеля — 35. Таму, канешне, многія працуюць там. Але застаюцца жыць у нас на вёсцы. Шмат хто будуецца тут, купляюць дамы, вельмі шмат дачнікаў у нас. Праблемы ўзнікаюць камунальныя. Старыя камунікацыі і сеткі знаходзяцца на балансе «Добрушскага камунальніка». Калі здараецца НЗ, службы рэагуюць, але ўсё роўна даводзіцца чакаць, бо ў першую чаргу закрываюцца патрэбы райцэнтра.

Старшыня Крупецкага сельсавета закранае і другую важную праблему:

— Ёсць недахоп у фінансаванні, і падатак па самаабкладанні жыхары выплачваюць неахвотна. Але многае можна вырашыць, калі ёсць ініцыятыўныя людзі, якія хочуць, каб ім і іх дзецям жылося лепш. Каб вакол было прыгожа, чыста, дагледжана.

Ёсць у аграгарадка і даволі сур'ёзны турыстычны патэнцыял. На беразе ракі стаіць драўляны Свята-Троіцкі храм, пабудаваны ў 1830 годзе. Прызнаны помнік архітэктуры драўлянага дойлідства не быў пашкоджаны падчас Вялікай Айчыннай. Увогуле Крупец як пасяленне мае доўгую і цікавую гістрыю, пра якую, напрыклад, моладзь можа апавядаць у сацсетках і такім чынам рабіць свой унёсак у мясцовы сельскі турызм.

Наталля КАПРЫЛЕНКА,
фота аўтара.

Информация об открытом аукционе по продаже права размещения средств наружной рекламы на объектах коммунальной собственности г. Гродно 7 апреля 2020 года

№ лота	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Кол-во конструкций (в шт.)/ кол-во сторон (плоскостей)	Начальная цена	Сумма задатка	Ориентировочная сумма затрат на проектную документацию	Характеристика объекта и условия использования
1	Право размещения средств наружной рекламы сроком на 3 года	Ул. Дарвина, со стороны транспортного кольца по ул. Горновых	1/1	248,21	24,82	761,60	Рекламная конструкция с подсветкой, на путепроводе (12х1,9 м)
2	Право размещения средств наружной рекламы сроком на 3 года	Ул. Дарвина, со стороны моста через реку Неман	1/1	248,21	24,82	761,60	Рекламная конструкция с подсветкой, на путепроводе (12х1,9 м)

Победители аукциона (рекламораспространители), которым по результатам аукциона определены места размещения средств наружной рекламы на объектах коммунальной собственности города Гродно, обязаны обратиться в установленном порядке:

1. В унитарное государственное коммунальное предприятие «Проектное бюро управления архитектуры и градостроительства Гродненского горисполкома» – за оформлением разрешительной документации на размещение средств наружной рекламы.

2. В Гродненский городской исполнительный комитет – для заключения договора по предоставлению права на использование городской среды в рекламных целях в течение 5 рабочих дней со дня получения документации, указанной в пункте 1.

3. Размещать средства наружной рекламы в строгом соответствии с выданными разрешениями на размещение средств наружной рекламы.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток (задатки) не позднее **1 апреля 2020 года** в размере, указанном в графе 6 таблицы (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:

• Копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

• Копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

• Юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:

• Легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

• Копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

Индивидуальный предприниматель:

• Копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

• Копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

Физические лица: копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

Заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

Торги в отношении каждого лота проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель аукциона обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона:

- возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение;

- перечислить в бюджет города Гродно сумму, за которую продан предмет аукциона;

- возместить расходы по разработке и согласованию паспортов и проектов привязок средств наружной рекламы к участкам местности УГКП «Проектное бюро управления архитектуры и градостроительства» Гродненского горисполкома.

Аукцион проводится в соответствии со ст. 417,418 Гражданского кодекса РБ и порядком, предусмотренном Инструкцией о порядке проведения аукционов по продаже права размещения средства наружной рекламы на объектах коммунальной собственности, утвержденной решением Гродненского городского исполнительного комитета от 28 июля 2018 г. № 450.

Аукцион состоится 7 апреля 2020 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **9 марта по 1 апреля 2020 года**.

Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720010,720537, 620809.

Официальные сайты организатора торгов www.grodno.gov.by, gcn.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-46162 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – котельня), общей площадью 147,6 кв. м, расположенное по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Солобутина, 12/1
Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 424385990401000747, площадью 0,0550 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания котельной), находящемся по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Солобутина, 12/1. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора), площадь 0,0550 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0175 га
Начальная цена продажи лота 2129,24 р. (две тысячи сто двадцать девять рублей двадцать четыре копейки) с учетом НДС
Сумма задатка – 213 (двести тринадцать рублей)
Новогрудский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231400, г. Новогрудок, ул. Гродненская, 103, тел. 8-01597-239-52
Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70
Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Условия оплаты – по договоренности сторон
Номер р/с для перечисления задатка – р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Аукцион состоится 17 марта 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209
Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/ Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 23.11.2019 г.
Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.
Последний день приема заявлений – 16 марта 2020 г. до 15.00

Телефон для справок 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion/

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», г. Борисов, ул. Даумана, 95

Предмет аукциона: капитальное строение
Местонахождение: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Даумана, 107/1

Наименование (назначение), составные части и принадлежности	Инвентарный номер	Общая площадь
Административное здание «Б» (здание административно-хозяйственное) Составные части и принадлежности: четырехэтажное административное здание «Б», пристройка (В1/к), подвал, рампа, крыльца (3 шт.), крыльцо	610/С-1407	5437,2 кв.м

В состав лота входят многолетние насаждения в количестве 18 штук

Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,4053 га, предоставлен Продавцу на праве аренды сроком по 13.07.2039 для обслуживания административного здания «Б»

Начальная цена (с НДС 20 %) – 2 518 670,60 белорусского рубля

Доп. информация: предмет аукциона обременен частичной арендой. Более подробная информация размещена на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Порядок ознакомления с предметом аукциона: в рабочие дни с 09.00 до 16.00 (+375 29 657-61-84)

Задаток 1% от начальной цены лота перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

Условия аукциона

Покупатель (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) обязан за свой счет:
- не позднее 6 месяцев с даты заключения договора купли-продажи предмета аукциона произвести демонтаж и разборку галереи, а также погрузку и вывоз с территории Продавца отходов, образовавшихся в результате демонтажа и разборки галереи;
- не позднее одного месяца с даты заключения договора купли-продажи предмета аукциона установить по всей границе земельного участка разделяющее территории Продавца и Покупателя со стороны территории Продавца непрозрачное, прочное, высотой не менее двух метров ограждение, оборудованное колючей проволокой «Егоза»

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Продавец или Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**10.04.2020 в 13.00**, по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»
Дата и время окончания приема документов	**08.04.2020 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»
Контактные данные	Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Группа многоэтажных жилых домов со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения и подземной гараж-стоянкой по пр. Дзержинского в микрорайоне Малиновка-1. Жилой дом № 4 по генплану со встроенно-пристроенными помещениями»,
опубликованную в газете «Звязда» № 26 (29140) от 08.02.2020

Для привлечения дольщиков к строительству по договору создания объекта долевого строительства для юридических и физических лиц предлагается помещение административно-торгового назначения **№ 19** общей площадью **133,60 кв. м**.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади помещения – 4590 (четыре тысячи пятьсот девяносто) белорусских рублей.

Условия оплаты – первоначальный взнос в размере 30 % стоимости объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства необходимы:
- паспорт (для физического лица), учредительные документы (для юридического лица);
- личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Документы для заключения договоров будут приниматься с **13.03.2020 по адресу: г. Минск, ул. Сергея Есенина, д. 4, офис 107, кабинет 11, понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, обед с 13.00 до 13.45, пятница с 8.30 до 16.15, обед с 13.00 до 13.45.**

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных помещений.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и государственное предприятие «Управление капитального строительства Запад» оставляет за собой право заключить договор на заявленное помещение с другим претендентом.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству объекта строительства можно получить по адресу: **220025, г. Минск, ул. Сергея Есенина, д. 4, офис 107, каб. 11, тел.: +375 (17) 234 16 98, +375 (44) 795 44 44.**

Сайт компании: ukszapad.by

ДА ГОДА МАЛОЙ РАДЗІМЫ

Не аднаразовая акцыя, а бесперапынны працэс

Што такое добраўпарадкаванне? Гэта прывабны знешні выгляд населеных пунктаў, камфортнае пражыванне людзей, экалагічнае асяроддзе. І, вядома, усё гэта ўплывае на выхаванне падрастаючага пакалення і ў цэлым на менталітэт грамадзян, вучыць беражліваму стаўленню да ўсяго, што іх акружае, лічыць галоўны спецыяліст Нясвіжскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр КАРНЮШКІН.

> Добраўпарадкаванне – гэта перш за ўсё адносіны людзей да навакольнага свету, традыцыя жыць у чысціні, камфорце. Добры гаспадар заўсёды сочыць за парадкам у сваім доме. А малая радзіма – наш агульны дом, і клапаціцца пра яго неабходна таксама ўсім разам, талакой.

– Больш за тое, Нясвіж мае статус нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Да нас штогод з блізкага і далёкага замежжа прыязджае больш за 300 тысяч гасцей: нехта праз турыстычнае бюро, а частка – самастойна. І сёння меркаванне пра Беларусь, у тым ліку і наш раён, складваецца па тым, як яны ўладкаваныя, – кажа Аляксандр Анатолевіч.– Таму гэтыя пытанні – адны з асноўных у рабоце райсавета і сельвыканкамаў. Летась на добраўпарадкаванне сельскімі Саветамі накіравана 87,5 тысячы рублёў. У тым ліку 40 тысяч пайшло на знос пустуючых дамоў – планавалася знесці 50, а па факце атрымалася 66 пабудоў. У гаспадарчы абарот прыцягнулі 149 участкаў, або амаль 50 гектараў. Дзесьці атрыманую зямлю засеялі сельскагаспадарчымі культурамі, а недзе гаспадаркі пабудавалі жыллё.

Зносяцца дамы за бюджэтныя сродкі, але дапамагаюць у гэтай справе і прыватнікі, выдзяляюць тэхніку сельгасарганізацыі. Акрамя таго, на сайце райвыканкама змяшчаецца спіс прыдатных для жылля пустуючых дамоў, з тым каб людзі змаглі іх купіць. Асабліва ахвотна грамадзяне набываюць дамы ў аграгарадках, дзе ёсць неабходныя камунікацыі, інфраструктура, у населеных пунктах, побач з якімі знаходзяцца вытворчыя аб'екты – ферма, машынна-трактарны парк. У радыусе 5-6 кіламетраў ад райцэнтра купіць пустуючыя дамы праблематычна, у насельніцтва яны карыстаюцца павышаным попытам. Ды і ў невялікіх вёсках таксама добра наладжана гэтая работа. Прычым купляюць жыллё не толькі беларусы, але і расіяне.

– Сёлета запланавана знесці 42 дамы. Адпаведна, на гэта выдзелены сродкі, як і летась – 952 рублі на адзін, – кажа Аляксандр Карнюшкін. – Работа ў гэтым кірунку арганізавана сістэмна, планава. Ужо з сярэдзіны года сельскія Саветы дэпутатаў пачынаюць працаваць на наступны год. Па кожным з сельсаветаў распісана інфармацыя літаральна па кварталах: колькі дамоў неабходна знесці, у якіх населеных пунктах. Да такой адказнай справы падыходзім вельмі скрупулёзна, з улікам усіх нюансаў, звяртаем увагу на любыя дробязі, вядзём перапіску, працуем з домаўладальнікамі, вытрымліваем усе адміністрацыйныя працэдуры, каб не было пытанняў у судзе, – канстатуе Аляксандр Карнюшкін.

Але знесці дом – палова справы. Неабходна яшчэ выкарчаваць сад, кусты, зруйнаваць фундамент, а дзе – і пограб, акультурыць участак. І тут ёсць праблема: на невялікія па памерах надзелы нельга заехаць энерганасычанай тэхнікай. У гэтым выпадку любы ахвотны можа ўзяць кавалак зямлі для вядзення агародніцтва або будаўніцтва.

– Наогул, добраўпарадкаванне ўключае шмат складнікаў: утрыманне могілак, уладкаванне дарог, агароджаў, азеляненне і многія іншыя кірункі. І гэта не аднаразовая акцыя, а працэс, які не прыпыняецца практычна круглы год, – адзначае мой суразмоўнік.–Добраўпарадкаванне – гэта перш за ўсё адносіны людзей да навакольнага свету, традыцыя жыць у чысціні, камфорце. Добры гаспадар заўсёды сочыць за парадкам у сваім доме. А малая радзіма – наш агульны дом, і клапаціцца пра яго неабходна таксама ўсім разам, талакой. Ды, на жаль, не ўсе гэта разумеюць або хочуць разумець. Мы выяўляем нядбайных гаспадароў, якія не сочаць за парадкам на сваім падворку. Толькі летась выпісалі ім 1668 прадпісанняў, за выкананнем якіх сочаць прадстаўнікі сельвыканкамаў.

За мінулы год сельскімі саветамі і насельніцтвам устаноўлена 3118 пагонных метраў агароджы, знесена 389 старых аварыйных дрэў. На тэрыторыі кожнага сельсавета штогод высаджваецца каля сотні маладых дрэў. Гэта ў трычатыры разы больш, чым зразаецца. У прыватнасці, да 80-годдзя Нясвіжа абапал дарогі на Сноў з'явілася алея – каля 500 маладых дрэўцаў. Азеляняюцца і тэрыторыі агульнага карыстання, пустыры.

У добраўпарадкаванне населеных пунктаў важкі ўнёсак робяць таксама святы вёсак, аграгарадкоў, вуліц, якія праводзяцца рэгулярна. Людзі наводзяць глянец на сваіх падворках і прылеглых тэрыторыях, падключаюцца мясцовыя сельгасарганізацыі. Нехта з кіраўнікоў выдзяляе грошы на ўладкаванне, хтосьці дапамагае тэхнікай, будаўнічымі матэрыяламі. Такія мерапрыемствы прымяркоўваюць, як правіла, да нейкай значнай мясцовай падзеі–адкрыцця дзіцячай пляцоўкі, садка, школы або гадавіны заснавання населенага пункта. Падобныя святы згуртоўваюць людзей, даюць магчымасць ствараць тут больш камфортныя ўмовы пражывання, а моладзі – глыбей спазнаць гісторыю і традыцыі сваёй малой радзімы, быту іх продкаў.

Яшчэ вельмі важна, што кожны сельскі Савет распрацаваў комплексны план развіцця населеных пунктаў з пералікам таго, што мяркуецца зрабіць для росквіту роднага кутка, у залежнасці ад фінансавых магчымасцяў. Што датычыцца добраўпарадкавання, то раней бюджэтныя сродкі на яго выдаткоўваліся сельвыканкамам, цяпер жа яны перадаюцца жыллёва-камунальнай гаспадарцы. Тут фарміруюць кадры, якія праходзяць субяседаванне пры прыёме на работу. З ведама старшынь сельскіх Саветаў яны будуць размеркаваны кожны на свой участак работы і будуць пастаянна трымаць з імі сувязь. Бо хто, як не яны, ведае праблемы сваіх тэрыторый і на што варта звярнуць увагу ў першую чаргу?

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 5 сакавіка 2020 года.